Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 МАЯ 2017 г. ПЯТНІЦА № 84 (28448)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Крэдыты без даведкі аб даходах

СТАР. 4



Як залячыць душэўныя раны

СТАР. 16



Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

# ДАВЯРАЛЬНАЕ, УСЕБАКОВАЕ, СТРАТЭГІЧНАЕ...

## Сакрэт поспеху беларуска-кітайскага супрацоўніцтва

**Падзею, якая ўчора адбылася ў Палацы Незалежнасці, Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Лукашэнка назваў гістарычнай. Упершыню да нас завітала такая вялікая група кітайскіх журналістаў — у рамках прэс-тура. Ключавой яго кропкай стала прэс-канферэнцыя беларускага лідара сродкам масавай інфармацыі Паднябеснай. Пытанні былі сур'ёзныя і закраналі як у цэлым двухбаковае супрацоўніцтва, так і розныя яго кірункі.**

### Калі свет становіцца непрадказальным...

У Беларусь прыехалі прадстаўнікі цэнтральных і рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі Кітайскай Народнай Рэспублікі. Звыш 40 журналістаў прадстаўляюць 28 друкаваных і электронных сродкаў масавай інфармацыі Паднябеснай.

— Ведаю, што вы знаходзіцеся ў Беларусі некалькі дзён, і ўжо паспелі трошкі пазнаёміцца з нашай краінай, даведацца пра яе эканамічны, культурны, навуковы патэнцыял, атрымаць уяўленне аб характары, традыцыях Беларусі, — сказаў кіраўнік краіны напачатку размовы. — Гэта першая наша з вамі сустрэча ў такім фармаце, і яе важнасць абумоўлена шэрагам прычын.



Першая — сёлета Беларусь і Кітай адзначаюць 25-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін. Сустрэча кітайскіх журналістаў з беларускім лідарам — значнае мерапрыемства юбілейнага года.

— Сусветная эканоміка і палітыка, на жаль, сталі непрадказальнымі, — канстатаваў Прэзідэнт. — Але насуперак сусветным выклікам Беларусь і Кітай стварылі моцныя, трывалыя і надзейныя міждзяржаўныя сувязі, адносіны даверальнага, усебаковага, стратэгічнага партнёрства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. Відаць, не знойдзецца ў Еўропе больш блізкай для Кітая краіны, чым Беларусь. Мы дасягнулі значных рэзультатаў і ў палітыцы, падтрымліваючы адзін аднаго ў міжнародных арганізацыях, і ў эканоміцы. Мы разам ствараем Кітайска-Беларускі індустрыяльны парк, рэалізавалі дзясяткі інвестыцыйных праектаў у энергетыцы, будаўніцтве. У гуманітарнай сферы ідзе абмен студэнтамі, развіваецца супрацоўніцтва ў галіне навукі, турызму.

Другая прычына, чаму сустрэча носіць асаблівы характар — прэс-тур арганізаваны спецыяльна напярэдадні саміта «Адзін пояс і адзін шлях», у якім прыме ўдзел і Беларусь. Падчас форуму запланавана асабістая сустрэча Прэзідэнта Беларусі і Старшыні КНР. На ёй лідары абмяркуюць як міжнародны парадак дня, так і развіццё двухбаковага ўзаемадзеяння. Трэцяя прычына, якую назваў Прэзідэнт, — прыезд кітайскіх журналістаў яшчэ раз падкрэслівае важнасць супрацоўніцтва паміж рэгіёнамі Беларусі і Кітая, бо менавіта там знаходзяцца асноўныя рэзервы ўзаемадзеяння.



Фота БЕЛТА.

### «Знаёміліся» доўга

Журналіст Цэнтральнага тэлебачання Кітая (CGTN) пацікавіўся, як беларускі лідар ацэньвае ўзровень беларуска-кітайскіх адносін і якой бачыцца яму іх будучыня. Аляксандр Лукашэнка расказаў, з чаго пачыналася цяперашняе ўзорнае сяброўства:

— Калі я яшчэ быў дэпутатам парламента, яшчэ да прэзідэнцтва, я бываў у КНР. Тады на ўвесь свет Кітай славіўся сваімі свабоднымі эканамічнымі зонамі — як дзяржава, якая развіваецца. І нам, пасля распаду Савецкага Саюза трэба было неяк аднаўляць эканоміку Беларусі. Трэба было, калі казаць прама, ратаваць дзяржаву. А ратаваць дзяржаву можна толькі ратуючы эканоміку. Тады, каб вывучыць рэжым функцыянавання гэтых свабодных эканамічных зон, падаткоы рэжым, урадавая дэлегацыя, і я быў у яе ліку, накіравалася ў КНР.

СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ЯРАШЭНКА, кіраўнік адміністрацыі індустрыяльнага парка «Вялікі камень»:**

*«Сёлета «Вялікі камень» будзе развівацца па формуле 20—10—5. Мы ставім перад сабой задачу, каб па выніках 2017 года ў парку зарэгістравалася не менш за 20 рэзідэнтаў (на гэты момант у нас іх дзевяць). Дзесяць рэзідэнтаў — гэта тыя, хто не проста зарэгіструецца, але і пачнуць будаваць свае вытворчыя аб'екты. Акрамя таго, у парку чакаюць, што пяць аб'ектаў у гэтым годзе ўжо будуць пабудаваны і ўведзены ў эксплуатацыю».*

■ Памяць

# Па слядах батальёна капітана Уладзімірава

## Пад Магілёвам упершыню вяліся раскопкі на месцы, дзе на пачатку вайны насмерць стаялі міліцыянеры



Фота Мікалая БАРЫСЕНКІ.

**Адзінае пахаванне на вышыні капітана Уладзімірава зроблена 25 гадоў таму (тут ляжаць астанкі 29 міліцыянераў і чырвонаармейцаў, што загінулі ў 41-м).**

**Ад абласнога цэнтра да гэтай безыменнай вышыні каля вёскі Гаі ўсяго некалькі кіламетраў. З дарогі відаць манумент у гонар мужных абаронцаў батальёна міліцыі, якім камандаваў капітан Канстанцін Уладзіміраў. Па некаторых звестках, з 250 міліцыянераў, сярод якіх былі выкладчыкі і курсанты магілёўскай, мінскай і гродзенскай школ міліцыі, выратаваліся толькі 19. Але гэтыя лічбы дагэтуль выклікаюць у гісторыкаў спрэчкі. Пакуль няма пацвярджальных дакументаў. Упэўнена сцвярджаць можна толькі адно: міліцыянеры трымаліся да апошняга.**

Магілёўскі інстытут МУС вось ужо некалькі гадоў займаецца пошукамі звестак пра сваіх мужных калег. Раскопкі на вышыні, дзе, як мяркуецца, змагаўся батальён, праводзіліся ўпершыню за ўсю пасляваенную гісторыю. Знайшліся некалькі сведак, якія на час вайны былі дзецьмі і ўсё бачылі на свае вочы. **Жыхар вёскі Засценкі Мікалай СЛЯПНЁЎ,** якому ў 41-м было 14 гадоў, паказаў траншэю, дзе ён з аднасяльчанамі пахаваў некалькіх міліцыянераў. «На іх былі сінія шынялі», — удакладніў ён. Яго аднагодка **Соф'я ВЕРАКСА, жыхарка вёскі Гаі,** у пахаванні не ўдзельнічала, але бачыла апошні бой.

— Раптоўна грымнула «ўра», і людзі ў сініх шынялях пабеглі ў атаку, — расказала жанчына. — Немцы адкрылі агонь. Адзін салдацік упаў, другі. Усяго я налічыла 8. Было вельмі спякотна, але немцы дазволілі хаваць забітых толькі на чацвёрты дзень.

Да пошукавых работ у Магілёве падрыхтаваліся грунтоўна. Упраўленне ўнутраных спраў Магілёўскага аблвыканкама паклапацілася, каб забяспечыць на месцы раскопак ахову правапарадку і дапамагло з міні-экскаватарам. Побач з ваеннымі 52-га спецыялізаванага батальёна працавалі курсанты інстытута МУС і пошукавікі Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «ВІККРУ». Але вынікі пошукаў, на жаль, сціплыя. Знойдзены астанкі аднаго байца, хутчэй за ўсё 394-га стралковага палка 110-й тульскай дывізіі. Гэты полк размяшчаўся якраз па суседстве з батальёнам міліцыі. Побач з астанкамі салдата ляжалі дзве вінтоўкі, якія знаходзіліся на ўзбраенні тулякоў. Ды і сіняга шыняля, як у міліцыянераў, не было. Знойдзены таксама металічны медальён. Ён перададзены на экспертызу, але знаўцы не вельмі спадзяюцца на ўдачу. За столькі гадоў усё, што знаходзіцца ўнутры, магло ператварыцца ў крохкі кавалак іржавага жалеза. Пластмасавыя медальёны ў гэтым сэнсе больш надзейныя.

СТАР. 4

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 05.05.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8834 | ▲ |
| Еўра | 2,0517 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0327 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0711 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ДАВЯРАЛЬНАЕ, УСЕБАКОВАЕ, СТРАТЭГІЧНАЕ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Менавіта ў той час, прызнаўся кіраўнік дзяржавы, у яго і выпрацаваўся план па аднаўленні эканомікі ў Беларусі на аснове вопыту Кітая, у прыватнасці, развіцця свабодных эканамічных зон. Але з Кітаем адносіны завязаліся не адразу. Традыцыйна, гэтая дзяржава доўга вывучае патэнцыяльных партнёраў, глядзіць, як можна з імі працаваць.

— Праз прыкладна 15 гадоў мы ўжо дасягнулі ўзроўню, калі Кітай ніколькі не вагаўся, адказваючы на пытанне, як будоўваць адносіны з Беларуссю. Гэта была вельмі важная кропка, — упэўнены беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў — у нашай краіне вельмі цэняць, што КНР выдзяляе нам вялікія крэдыты.

— Мы гаворым пра тое, што зараз карыстаемся лініяй у 15 мільярдаў долараў, але кіраўніцтва Кітая заўсёды кажа, што калі нам патрэбны будуць грошы для развіцця эканомікі, крэдытныя рэсурсы, яно нам дапаможа настолькі, колькі ў нас будзе нармальных акупных праектаў. У гэтых адносінах у нас абсалютна ніякіх праблем няма, — заявіў Прэзідэнт Беларусі.

— У нас вельмі добрыя адносіны, і мы чакаем ад нашых адносін яшчэ большай рэзультатыўнасці. Нам вельмі важна зараз прасунуцца ў эканамічных пытаннях, больш аператыўна прыцягваць у індустрыяльны парк «Вялікі камень» самыя перадавыя прадпрыемствы з самымі перадавымі тэхналогіямі — заўтрашняга, а можа, і паслязаўтрашняга дня, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

## Амаль падваенне ВУП

Прадстаўнік Гуандунскай тэлерадыёкампаніі пацікавілася, як Беларусь разумее ініцыятыву «Адзін пояс і адзін шлях». Як краіна-заснавальніца ЕАЭС, якія магчымасці для гэтай арганізацыі бачыць наша дзяржава?

— Амаль усе ставяць нейкія палітычныя ўмовы, хоць рэалізуюцца эканамічныя праекты, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Кітай ніколі нікому падобных умоў не ставіць, і нам у тым ліку. Калі б ставіліся такія папярэднія ўмовы, у нас бы, відаць, з вамі былі такія адносіны, як з еўрапейцамі ці амерыканцамі. Але Кітай — не з лісліваслі кажу — мудрэйшая нацыя. Яны разумеюць, што інвестыцыі толькі тады будуць карысныя, запатрабаваныя, акупныя, калі ў дзяржаве будзе стабільнасць і бяспека.

Гэта Кітай знайшоў у Беларусі — і пачаў будаваць з намі адносіны без папярэдніх умоў.

Як вядома, новы Шаўковы шлях пройдзе праз многія краіны, не толькі праз нашу дзяржаву. Гэта і краіны Усходняй Еўропы, і азіяцкія краіны. Кітай інвесціруе велізарныя сродкі ў эканоміку гэтых дзяржаў. Вось такі прыклад прывёў кіраўнік дзяржавы:

— Гэта валютная выручка ў 50 мільярдаў долараў — калі мы створым, як бачылася, гэты індустрыяльны парк. Гэта велізарная дапамога для нашай краіны. Гэта амаль падваенне ВУП Беларусі... Важна, што будучы гэтыя адносіны, Кітай нас усюды падтрымлівае.

Прэзідэнт таксама зазначыў, што пасля таго, як Беларусь пачала больш глыбокае супрацоўніцтва з КНР, адкрыліся новыя магчымасці для экспарту нашай прадукцыі ў Паднябесную. Што да Еўразійскага эканамічнага саюза, то гэта велізарная тэрыторыя і магчымасці для КНР — і ў плане прыродных рэсурсаў, і ў плане высокакваліфікаванай рабочай сілы. У той жа час кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: для дасягнення нашых мэт трэба хутка прымаць рашэнні і хутка дзейнічаць, маруднасці ў сучасным свеце месца няма.

## Задзел на будучыню

Журналіст «Жэньмінь жыбаа», афіцыйнай газеты Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Кітая, у працяг тэмы спытаў у Прэзідэнта, чаго чакае Беларусь ад удзелу ў саміце «Адзін пояс і адзін шлях».

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што плануе праінфармаваць свайго кітайскага калегу Сі Цзіньпіна, як ідзе развіццё індустрыяльнага парку, як развіваюцца іншыя сферы двухбаковага супрацоўніцтва — у тым ліку ў галіне бяспекі, барацьбы з тэрарызмам.

— Таму гэта вельмі-вельмі важны візіт. Ён будзе важным на будучыню — у плане, калі можна так сказаць, удасканалення нашых адносін па развіцці даверальнага ўсебаковага стратэгічнага супрацоўніцтва. Але самае галоўнае — стратэгія ў нас з вамі адна. Мы павінны зрабіць так, каб новыя пакаленні, якія з'явяцца ў Кітаі і Беларусі, ужо мелі фундамент адносін.

Журналістка газеты «Веснік Ганьсу» пацікавілася, як можна выкарыстаць магчымасці для пашырэння рэгіянальнага супрацоўніцтва.

— Гэта аснова нашых адносін, гэта тое, што можа значна прасунуць нашыя адносіны ў канкрэтных сферах, у канкрэтных абласцях, — адзначыў Прэзідэнт, падкрэсліўшы, што правінцыя Ганьсу, супрацоўнічаючы з Гродзенскай вобласцю, атрымае літаральна прамы выхад у Заходнюю Еўропу.

Прадстаўніца Міжнароднага радыё Кітая расказала цікавы факт: на базе яе СМІ працуе адзіны ў Кітаі інфармацыйны сайт на беларускай мове. Ён быў створаны ў 2010 годзе пры падтрымцы Белтэлерадыёкампаніі. На думку журналісткі, гэты сайт можна лічыць адным з доказаў цесных сувязяў паміж нашымі краінамі ў сферы СМІ. Цікавілася ж карэспандэнтка тым, як Беларусь і Кітай могуць супрацоўнічаць у плане паставак мяса-малочнай прадукцыі ў Кітай, які, дарэчы, з'яўляецца буйнейшым у свеце імпарцёрам такіх тавараў.

— Гэта датычыцца вельмі важнай праблемы ў нашых адносінах, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — У нас вялікі дэфіцыт у гандлі з КНР, і мы гэту праблему абмяркоўваем. Калі на апошняй сустрэчы сказаў пра гэта Сі Цзіньпіну, то і ён, і ў наступным з кім бы з кіраўнікоў я не сустракаўся — заяўляюць: мы вельмі хочам дыверсіфікаваць нашы гандлёва-эканамічныя адносіны такім чынам, каб яны былі выраўненыя. Я веру ў гэтыя заявы кітайскіх кіраўнікоў, паколькі гэта абсалютна не парушыць тую стабільнасць, прыцягальнасць і тыя магчымасці кітайскага экспарту ў іншыя краіны, калі будзем мець парытэт у нашым гандлі.

Што да прадуктаў харчавання, то выйсці з імі на кітайскі рынак складана: вельмі высокія патрабаванні з боку органаў, якія кантралююць якасць такіх прадуктаў.

— Трэба мець вельмі высокі ўзровень прадуктаў харчавання. Але з намі — я нават здзівіўся — праблем не было. Мы за некалькі месяцаў сертыфікавалі мяса-малочную прадукцыю і сёння мы ўжо гандлюем самі мяснымі, малочнымі прадуктамі. І гэта не ў тэставым рэжыме, мы ўжо даўно прайшлі гэты шлях, — расказаў кіраўнік дзяржавы.

## Вырашыць нешта без Кітая сёння немагчыма

Карэспандэнт агенцтва «Сіньхуа» спытаў, якой Беларусь бачыць ролю Кітая ў свеце.

— Гэта можна сказаць адной фразай: ні адно глабальнае ці рэгіянальнае пытанне без меркавання, удзелу Кітайскай Народнай Рэспублікі вырашыць сёння немагчыма, — лаканічна адказаў Прэзідэнт. — Дадайце да таго тое, што КНР з'яўляецца пастаянным членам Савета Бяспекі ААН. Гэта ядзерная дзяржава з велізарным патэнцыялам насельніцтва — паўтара мільярда чалавек. Гэта адна з найбуйнейшых тэрыторый у свеце. І самае галоўнае — гэта краіна, якая развіваецца гіганцкімі тэмпамі. У сілу гэтага Кітай займае дамінуючае становішча ў свеце. Без яго немагчыма сёння вырашаць ні дыпламатычныя, ні палітычныя, ні іншыя пытанні. Тое, што нова-абраны Прэзідэнт ЗША перш за ўсё запрасіў да сябе, заўважце, Сі Цзіньпіна, якраз пацвярджае гэты тэзіс.

Карэспандэнт агенцтва «Чайна ньюс» пацікавілася асабістымі адносінамі лідараў Беларусі і Кітая.

— У палітыцы ад асабістых адносін многае залежыць, а ў адносінах з асобамі дзяржавамі залежыць усё. Калі асабістыя адносіны выключныя, значыць, выключныя адносіны міждзяржаўныя, — адказаў беларускі лідар. — У нас з Сі Цзіньпінам вельмі сяброўскія адносіны. Ён бывае ў мяне дома, я ад яго нічога не хаваю... Глыбіня нашых адносін — гэта, перш за ўсё, яго адносіны да нашай краіны і да нашага народа. Мы гэта вельмі цэнім.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ Меркаванні

# Прыклад для іншых

## Удзельнікі размовы дзеляцца ўражаннямі

**Кірыл РУДЫ, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Кітаі:**

— Беларусь наладзіла добрыя адносіны з ініцыятарам ідэі «Адзін пояс і адзін шлях» Сі Цзіньпінам яшчэ да таго, як ён стаў Старшынёй КНР і прапанаваў рэалізаваць гэты праект. Мы хутка ўліліся ў яго і ўжо маем адносна іншых краін пэўныя перавагі. Зараз, калі Кітай спрабуе намацаць практычныя пункты, як рэалізаваць гэтую ідэю, хоча паглядзець на першыя вынікі, то мы адны з першых, дзе створана інфраструктура і з'яўляюцца першыя кампаніі. Прыклад Беларусі даказвае рэальнасць ініцыятывы, і наша краіна з'яўляецца добрым прыкладам для іншых. Кітай, думаю, не шкадуе і ганарыцца тым, што мы разам рэалізуем такі праект у Беларусі.

**Цуй Цымін, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Беларусі:**

— Гэтыя мерапрыемствы маюць гістарычнае значэнне. Яны адбыліся ўпершыню за 25 гадоў дыпламатычных адносін паміж нашымі краінамі. Ваша краіна запрасіла больш за 40 журналістаў з розных рэгіёнаў. Яны мелі магчымасць задаваць пытанні Прэзідэнту аб адносінах Беларусі і Кітая, пра тое, як мы будзем разам будаваць эканамічны пояс Шаўковага шляху. Прэс-тур кітайскіх журналістаў у Беларусь, іх сустрэча з Аляксандрам Лукашэнкам — важны крок у развіцці двухбаковага супрацоўніцтва.

**Жэнь Ці, карэспандэнт газеты «Чайна Дэйлі»:**

— Падчас сустрэчы быў выбудаваны прыемны, добразычлівы дыялог паміж Прэзідэнтам і нашымі СМІ. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што Беларусь і Кітай у розных галінах падтрымліваюць вельмі высокі ўзровень узаемадзеяння і партнёрства. Мне спадабалася, што адказы Аляксандра Лукашэнкі былі вельмі шчырымі, і мы ўдзячныя за гэты адкрыты дыялог. Думаю, што ён з'яўляецца сімвалам нашых беларуска-кітайскіх партнёрскіх узаемаадносін і сведчыць пра высокі ўзровень узаемадзеяння паміж краінамі.

**Юань Бааго, карэспандэнт Шаньдунскай тэлерадыёкампаніі:**

— Ваш Прэзідэнт вельмі добра ведае Кітай і дасведчаны аб дасягненнях у развіцці нашай краіны. Ён вельмі дакладна і ўсебакова распавёў пра беларуска-кітайскае супрацоўніцтва. Аляксандр Лукашэнка з'яўляецца вельмі добрым сябрам для нашай краіны, бо паміж нашымі дзяржавамі склалася моцнае супрацоўніцтва. Мы павінны шанаваць яго і прасоўваць, таму што такія добрыя, шчырыя адносіны паміж дзяржавамі вельмі важныя для іх народаў. Мы павінны браць прыклад з вас, вашага Прэзідэнта, як неабходна ствараць моцныя, сяброўскія сувязі паміж краінамі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Расія хоча ўвесці сваю грын-карту

У Расійскай Федэрацыі рыхтуюць сваю грын-карту. Газета «Известия» апублікавала матэрыял пра тое, што міністэрства сувязі і масавых камунікацый краіны прапануе ўвесці з 2019 года расійскі аналаг грын-карты.

Плануецца, што грын-карта дасць высокакваліфікаваным замежным грамадзянам расійскага паходжання, якія свабодна валодаюць рускай мовай, права ўезду ў Расію і працы на тэрыторыі краіны. Як адзначае газета, такія планы апісаны ў праекце праграмы «Лічбавая эканоміка», падрыхтаваным міністэрствам.

## Ле Пен лічыць, што ў выпадку яе паражэння на выбарах Францыяй будзе кіраваць Меркель

Лідар «Нацыянальнага фронту» нагадала, што яе сапернік Эмануэль Макрон трымае курс на «безумоўнае падпарадкаванне Еўрапейскаму саюзу».

«Як бы там ні было, Францыяй у далейшым будзе кіраваць жанчына — альбо гэта буду я, альбо гэта будзе Ангела Меркель», — сказала лідар «Нацыянальнага фронту», якая раней крытыкавала Макрона за яго намер умацоўваць франка-германскі саюз як аснову Еўрасаюза.

«Рэальнасць — гэта тое, што вы ўжо пабывалі з візітам у спадарыні Меркель і папрасілі ў яе блаславення, паколькі вы не маеце намеру што-небудзь рабіць без яе згоды», — заявіла Ле Пен, падкрэсліўшы, што яе сапернік на выбарах трымае курс на «безумоўнае падпарадкаванне Еўрапейскаму саюзу».

На гэта Эмануэль Макрон запярэчыў Ле Пен, у прыватнасці заявіўшы, што «на шчасце, у Францыі заўсёды былі палітыкі, якія ўмелі глядзець у будучыню. І генерал дэ Голь і канцлер Адэнаўэр здолелі працаваць разам і пабудавалі такім чынам цяперашнюю Еўропу».

## Тылерсан: адміністрацыя Трампа не будзе навязваць амерыканскія каштоўнасці іншым краінам



Новая адміністрацыя ЗША на чале з прэзідэнтам Дональдам Трампам не збіраецца навязваць амерыканскія каштоўнасці іншым краінам. З такім запэўненнем выступіў дзяржсакратар Рэкс Тылерсан.

З пункту гледжання Тылерсана, ЗША не змогуць «дабіцца мэт у сферы нацыянальнай бяспекі» ці забеспячэнні сваіх інтарэсаў, калі будуць у дыялогу з замежнымі партнёрамі ставіць у якасці ўмовы прынясце амерыканскіх каштоўнасцяў.

«Калі мы занадта моцна будзем рабіць упор на тое, што іншыя краіны павінны прыняць гэтыя каштоўнасці, да якіх мы ішлі на працягу доўгай уласнай гісторыі, то гэта ў рэальнасці стварае перашкоды магчымасці прасоўваць наперад нашы інтарэсы ў сферы нацыянальнай бяспекі, нашы эканамічныя інтарэсы», — лічыць дзяржсакратар.

Як адзначыў Тылерсан, «надзвычай важна разумець розніцу паміж палітыкай і каштоўнасцямі».

## НА СУВЯЗІ КОЖНЫ ТЫДЗЕНЬ

**Набіраць па суботах нумар тэлефона гарадской, раённай ці абласной адміністрацыі — ужо традыцыя. Прамыя лініі дапамагаюць хутка, а галоўнае — эфектыўна рэагаваць на праблемы. 6 мая чыноўнікі ў розных кутках Беларусі зноў выйдуць на сувязь з народам. Колькасць зваротаў становіцца ўсё меншай, ды і праблемы грамадзян імкнуцца вырашаць, што называецца, па гарачых слядах.**

Тэлефонныя лініі з 9.00 да 12.00 правядуць:

**Брэсцкі аблвыканкам**
намеснік старшыні СЯРКОЎ Міхаіл Мікалаевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
кіраўнік спраў СЫСОЕЎ Аляксандр Уладзіміравіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ГАРБАЧОЎ Уладзімір Уладзіміравіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ШУЛЕЙКА Юрый Вітольдавіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ЯНКОЎ Дзмітрый Васілевіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні МАКАР Ігар Мікалаевіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам**
намеснік старшыні ЛАПЦЕЎ Віктар Сяргеевіч (80172224444).

# АБ РОЛІ І ЗНАЧНАСЦІ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**Учора ў рамках выстаўкі «СМІ ў Беларусі» адбыўся круглы стол на тэму «Роля мясцовага самакіравання ў грамадскім і сацыяльна-эканамічным жыцці рэгіёнаў і краіны ў цэлым».**


Фота Надзеі БУЖАН.

Арганізатарам мерапрыемства выступілі Міністэрства інфармацыі і Выдавецкі дом «Звязда». І гэта не выпадкова: на старонках нашай газеты ўжо дванаццаць гадоў выходзіць дадатак «Мясцовае самакіраванне». Якім павінен быць прадстаўнік найбліжэйшай да людзей галіны ўлады на сучасным этапе? Якімі павінны быць самі мясцовыя Саветы, каб пацвердзіць сваю патрэбнасць і жыццядзейнасць, і як сёння ацэньваецца эфектыўнасць дэпутацкай дзейнасці? Якая роля рэспубліканскіх і рэгіянальных СМІ ў сувязі дэпутатаў усіх узроўняў з выбаршчыкамі? Гэтыя пытанні сталі асновай для зацікаўленага кампетэнтнага абмеркавання, у якім прынялі ўдзел старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Аляксандр Папкоў, старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Леанід Цупрык, міністр інфармацыі Лілія Ананіч, кіраўнікі ўсіх узроўняў мясцовых Саветаў, рэспубліканскіх і рэгіянальных СМІ, прадстаўнікі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Падрабязны матэрыял аб рабоце і выніках круглага стала чытайце ў наступных выпусках «Мясцовага самакіравання».

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

## Месяц добрых спраў

### Калі вы яшчэ не валанцёр Беларускага Чырвонага Крыжа, далучайцеся ў маі

**Звыш 600 тысяч чалавек атрымліваюць штогод дапамогу і паслугі ад Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа.**

Толькі служба сясцёр міласэрнасці абслугоўвае дома на працягу аднаго года каля 1300 чалавек і аказвае звыш мільёна паслуг. Сёння актыўна пры гэтым выкарыстоўваецца методыка кінестэцікс, якая дапамагае падапечным развіваць рухальную актыўнасць і здольнасць да самаабслугоўвання. У таварыства ёсць два дзённыя цэнтры: у Гродне для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі і ў Мінску — сацыяльны цэнтр для людзей з псіхічнымі захворваннямі. Займаецца Беларускі Чырвоны Крыж і падтрымкай людзей з туберкулёзам і ВІЧ/СНІДам. У 12 населеных пунктах працуе 14 груп, якія прапагандуюць здаровы лад жыцця. 80 валанцёраў прайшлі падрыхтоўку па рэагаванні на надзвычайныя сітуацыі, служба мае два кіналагічныя атрады, інфацэнтр «201», рэзерв запасу прадметаў першай неабходнасці на тысячу пацярпелых. За пяць гадоў дапамогу падчас надзвычайных сітуацый атрымалі каля 40 тысяч чалавек. 22 праекты Беларускага Чырвонага Крыжа арыентаваныя на розныя катэгорыі людзей, якім неабходна падтрымка, у тым ліку гэта дапамога бежанцам і вымушаным перасяленцам з Украіны.

Паводле слоў генеральнага сакратара Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Вольгі МЫЧКО, у найбліжэйшыя дні абласныя і рэгіянальныя арганізацыі павіншуюць ветэранаў і ўручаць ім памятныя падарункі. Будуць падведзены вынікі бязвыплатнага донарства, а таксама ўручаны валанцёрскія білеты ўсім, хто далучыўся з ліку моладзі і не толькі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

## ■ З пачынам!

### У Мінску стартуе трэці працоўны семестр 2017 года

**5 мая на плошчы Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь у Мінску адбудзецца цырымонія адкрыцця трэцяга працоўнага семестра 2017 года, арганізатарам якой выступае Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў (РШСА) БРСМ.**

Ва ўрачыстым мерапрыемстве, прысвечаным афіцыйнаму старту трэцяга працоўнага семестра, прымуць удзел больш за 800 прадстаўнікоў студатрадаўскага руху з усіх рэгіёнаў краіны. Цэнтральная падзея цырымоніі — традыцыйнае ўручэнне кіраўнікамі профільных міністэрстваў і ведамстваў, а таксама грамадскіх арганізацый працоўных пуцёвак для работы ў студэнцкіх атрадах у 2017 годзе.

Кульмінацыяй маладзёжнага свята, упісанага ў летапіс студатрадаўскага руху 55 гадоў таму, стане працоўная акцыя «Праца — Крута». Сёлета аб'ектам увагі байцоў студэнцкіх атрадаў выбраны сталічны стадыён «Дынама», на якім праходзіць рэканструкцыя.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## ■ Напярэдадні падзеі

# «НЯЎХІЛЬНА ІМКНУЦЦА ДА ВЫСОКАЙ МЭТЫ»

### У мінулым — узлёт у Астраве і правал у Піцеры, а што чакаць ад нашай хакейнай зборнай на сёлетнім першынстве ў Парыжы?



**Вылучаецца гэтае першынство і сваімі талісманамі, імі будуць папулярныя персанажы еўрапейскіх коміксаў — Астэрыкс і Абелікс.**

**81-ы чэмпіянат свету па хакеі трэці раз у гісторыі прымуць адразу дзве краіны — Францыя і Германія. Група А выступіць у нямецкім Кёльне, матчы пройдуць на самай буйной у Еўропе пляцоўцы — «Ланксес-Арэна», якая ўмяшчае 18 500 гледачоў. Тут жа адбудуцца і вырашальныя матчы плэй-оф. Апошні раз Германія прымала хакейны сусветны турнір у 2010 годзе, а наогул на яе рахунку ўжо 7 такіх хакейных спаборніцтваў. Францыя ў гэтым сэнсе менш вопытная, папярэдняе планетарнае хакейнае першынство прымала ажно 65 гадоў таму, а наогул у гісторыі гэтай краіны іх было 4. Група В згуляе ў Парыжы на арэне «Берсі» ўмяшчальнасцю 15 000 гледачоў, там будзе выступаць і наша зборная.**

Сёлетні чэмпіянат можа стаць асаблівым, бо менавіта зараз у турніра ёсць выдатная магчымасць перахапіць званне самага прэстыжнага і цікавага міжнароднага хакейнага спаборніцтва планеты. Па забароне Нацыянальнай хакейнай лігі яе гульцы не змогуць прымаць удзел у Алімпійскіх гульнях, таму адзіная магчымасць убачыць зорак НХЛ — гэта планетарнае першынство. Да таго ж чэмпіянат свету 2017 з'яўляецца перадалімпійскім і для некаторых зборных менавіта ён будзе апошняй пробай сіл перад Гульнямі ў Пхенчхане.

Што датычыцца зборнай Беларусі, то яна дыслакуецца ў Францыі ўжо з пачатку месяца, у Бардо наша каманда завяршыла падрыхтоўку да чэмпіянату апошнімі матчамі Еўравыкліку і перабралася ў Парыж.

Дарэчы, па дарозе з камандай здарыўся інцыдэнт. Калі цягнік, у якім знаходзілася наша зборная, прыбыў на вакзал, паліцыя правяла пільны надгляд багажу галоўнага трэнера Дэйва Льюіса, яго памочнікаў Крэйга Вудкрафта і Алега Антаненкі, а таксама некалькіх ігракоў зборнай. Адзін з відавочцаў расказвае: «Такое адчуванне, што мы папалі на мытны надгляд. Прычым davoлі жорсткі: асабістыя рэчы ігракоў і трэнераў вельмі пільна аглядалі. Як здалося, з асаблівай стараннасцю аглядзелі багаж узроставых трэнераў. Што датычыцца ўрача нашай зборнай, то ў яго рэчах перагледзелі кожную таблетку і ампулу». Працэдура заняла каля паўгадзіны, пасля таго, як паліцэйскім не ўдалося нічога знайсці, усе былі адпушчаны.

Міністэрства замежных спраў Беларусі ў афіцыйным акаўнце твітара паведаміла, што пасольства ў Францыі падтрымлівае кантакт з нашай зборнай. У сувязі з нечаканым надглядам у французскага боку запытаны тлумачэнні. Акрамя таго, у сувязі з інцыдэнтам са зборнай Беларусі па хакеі пасол Францыі ў Беларусі Дзідзье Канес быў выкліканы ў Міністэрства замежных спраў.

Вернемся да хакея. Мэты ў каманды Дэйва Льюіса накont чэмпіянату свету па-ранейшаму высокія, перад ад'ездам каманды настаўнік адзначыў, што задача з часу яго прыходу ў зборную не памянялася і сёлета яны па-ранейшаму маюць намер змагацца за ўзнагароды. «Калі не ставіць высокіх задач, немагчыма дасягнуць большага, але, калі няўхільна імкнуцца да высокай мэты, рана ці позна яе дасягнеш. Безумоўна, у нашым выпадку гэта адбудзецца не сёння і не заўтра — наш шлях цярністы», — адзначыў Льюіс.

Галоўны трэнер таксама падкрэсліў, што на сёлетнім чэмпіянаце ён мае найлепшы склад з тых, з якімі даводзілася працаваць у мінулыя гады. Ён адзначыў, што вельмі задаволены абарончай лініяй і выказаў надзею на тое, што нападзенне зможа прыбавіць імпэту ўжо непасрэдна на турніры. «Першыя тры сустрэчы на чэмпіянаце свету будуць дастаткова складаныя. У сапернiках — высокапрафесійныя каманды з выкаладчыцамі ўзроўню КХЛ і НХЛ. На жаль, у нас няма зорных індывідуальнасцяў накшталт Авечкіна або Кросбі, таму наша стратэгія будзе заключацца менавіта ў зладжанасці камандных дзеянняў», — дадаў Льюіс.

Нагадаем, пад кіраўніцтвам гэтага канадскага спецыяліста зборная Беларусі была 7-й на чэмпіянаце свету ў Астраве ў 2015 годзе і 12-й летась у Санкт-Пецярбургу.

Сёлетні чэмпіянат стартуе 5 мая, у гэты ж дзень зборная Беларусі сустрэнецца з фінамі, групавая стадыя прадоўжыцца для нашай каманды да 16 мая, а сам чэмпіянат свету да 21 чысла. Па выніках папярэдняга турніру ў плэй-оф трапяць зборныя, якія занялі першыя 4 месцы ў сваіх групах.

Адзначым, што Белтэлерадыёкампанія дасць магчымасць нашым балельшчыкам пабачыць усе матчы першынства — 64 гульні. Сустрэчы з удзелам зборнай Беларусі на стадыі групавога раўнда і ў выпадку выхаду ў плэй-оф будзе трансляваць тэлеканал «Беларусь 1». «Беларусь 5» і «Беларусь 2» пакажуць астатнія матчы турніру.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

**Склад зборнай Беларусі:**

**варатары —** Кевін Ланланд, Міхаіл Карнавухаў, Віталь Трус;

**абаронцы —** Раман Грабарэнка, Ілья Шынкевіч, Крысціян Хенкель, Яўген Лісавец, Дзмітрый Корабаў, Уладзімір Дзянісаў, Павел Верабей, Алег Явенка;

**нападаючыя —** Сяргей Дрозд, Аляксандр Кулакоў, Арцём Волкаў, Аляксандр Паўловіч, Даніла Карабань, Яўген Кавыршын, Андрэй Стась (к), Сяргей Касціцын, Андрэй Касціцын, Арцём Дзямкоў, Ягор Шаранговіч, Аляксандр Когалеў, Міхаіл Стэфановіч, Шарль Лінгле.

У штаб зборнай Беларусі пад кіраўніцтвам Дэйва Льюіса ўвайшлі Крэйг Вудкрафт, Уладзімір Бурэ, Алег Антоненка, Яры Каарэла, Андрэй Мезін, а таксама відэатрэнер Вячаслаў Гусаў.

**Расклад гульняў з удзелам беларускай зборнай:**

*5 мая* 17.15. Фінляндыя — **Беларусь,**
*6 мая* 17.15. Беларусь — Чэхія,
*8 мая* 17.15. **Беларусь —** Канада,
*10 мая* 17.15. Швейцарыя — **Беларусь,**
*12 мая* 21.15. Францыя — **Беларусь,**
*13 мая* 17.15. Славенія — **Беларусь,**
*16 мая* 13.15. **Беларусь —** Нарвегія.

| Група А | Група В |
|---|---|
| Швецыя | **Беларусь** |
| Расія | Фінляндыя |
| ЗША | Чэхія |
| Германія | Канада |
| Латвія | Швейцарыя |
| Данія | Францыя |
| Славакія | Славенія |
| Італія | Нарвегія |

## ■ Здарэнне

### Калі суб'ект не ў стане

**У Брэсце міліцыянеры спынілі аўтамабіль, форма кіравання якім выклікала занепакоенасць.**

Падазрэнні аказаліся не марнымі, за рулём сядзела п'яная жанчына. Пазней экспертыза паказала 2,5 праміле алкаголю ў крыві. А калі інспектар стаў афармляць пратакол, 30-гадовая брастаўчанка адразу заснула ў яго на плячы.

А ў Пінску тым часам зусім нецвярозы грамадзянін ноччу на прычале абапёрся на парэнчы, страціў раўнавагу і ўпаў у ваду. Сам ужо выбрацца не змог. Добра, што побач былі супрацоўнікі Пінскай выратавальнай станцыі. Яны ў цемры змаглі хутка знайсці таго, хто тануў, і дастаць з вады.

...Некалі адна раённая газета напісала пра факт нецвярозасці брыгадзіра крыху нейтральна: «Ён не ў стане» — у сэнсе выконваць абавязкі. А вяскоўцы доўга смяяліся: «Вядомая рэч — напіўся і не ўстане». Дык навошта ж зноў і зноў нашы суайчыннікі бяруцца вадзіць машыну, гуляць ноччу па прычале, калі не ў стане гэта рабіць?

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.

**Продавец:** транспортное республиканское унитарное предприятие «Витебское отделение Белорусской железной дороги» (Витебская дистанция гражданских сооружений), г. Витебск, ул. Космонавтов, 10, тел. (0212) 37-81-85

Лот №1. Право на заключение договора аренды сроком на 3 года нежилых помещений площадью 222,0 кв. м, расположенного на 1-м этаже капитального строения (административное здание (хозяйственный блок СПК) с инв. №200/С-54277 по адресу: г. Витебск, ул. Карла Маркса, 4 для размещения станции технического обслуживания и диагностики автомобилей, офисные помещения. Ежемесячный размер арендной платы 159,84 базовой арендной величины. **Начальная цена:** 843,60 руб. **Задаток:** 84,36 руб.

**Дата, время и место проведения аукциона:** 06.06.2017 в 11.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и подачи документов:** с 05.05.2017 с 8.30 по 05.06.2017 до 17.30

**Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукционы проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08 2009 №1049. Юридические, физические лица, индивидуальные предприниматели обязаны подать организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы, предоставить: копию платежного документа о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона; юр. лицом – резидентом РБ: копию документа, подтверждающую гос. регистрацию юр. лица; юр. лицом – нерезидентом РБ: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; индивидуальным предпринимателем: копию документа, подтверждающего гос. регистрацию индивидуального предпринимателя. При подаче заявления на участие в аукционе предъявляется документ, удостоверяющий личность; представителями – оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица). Победитель аукциона – лицо, предложившее самую высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к Победителю аукциона) обязан оплатить предмет аукциона, затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; заключить договор аренды недвижимого имущества не позднее 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. В случаях если Победитель аукциона (лицо, приравненное к Победителю аукциона) не подписал протокол аукциона; не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона; не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона; не подписал договор аренды, а также, в случае если участники аукциона отказались объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным, указанными лицами уплачивается штраф в размере 100 базовых величин. Сумма задатка перечисляется на р/с организатора аукциона: №3012078870010 ЗАО «МТБанк», г. Минск, БИК 153001117, УНП 390477566. Конт. тел. (0212) 42-61-62, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by



Утерянный полис страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БА 1061182 **считать недействительным.**

# По слядах батальёна капітана Уладзімірава

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Асноўныя знаходкі — савецкія і нямецкія гільзы, патроны, асколкі снарадаў. Немцы былі паслядоўнымі ў вядзенні бою: авіяцыя, артылерыя, мінамёты, пяхота. Батальён міліцыі супрацьстаяў гэтай браніраванай моцы стралковай зброяй — пісталетамі, наганамі, вінтоўкамі. Але ў міліцыянераў быў вялікі запас мужнасці і стойкасці.



Мемарыял у гонар капітана Канстанціна Уладзімірава і яго мужнага батальёна.

На месцы былых баёў сёння пералесак. Пра гарачае лета 41-га нагадвае толькі абеліск. Але зямля тут звініць ад металу. Для многіх курсантаў МУС, аднагодкаў тых, хто стаяў тут насмерць у ліпені 41-га, гэта першая вахта. Іван Маручак шмат чаго чуў пра вайну з вуснаў дзеда. Цяпер вось сам дакрануўся да ваеннай гісторыі, ацаніў, наколькі страшнымі былі баі. Уладзіслаў Есьман таксама добраахвотнік. Яго прадзед ваяваў на Палессі. Невялікі вопыт у пошукавай справе ў юнака ўжо ёсць: прымаў удзел у раскопках у Гомельскай вобласці. «Для нашых курсантаў удзел у пошукавых работах — гэта свайго роду школа патрыятызму, магчымасць непасрэдна дакрануцца да падзей часоў Вялікай Айчыннай вайны», — кажа **намеснік начальніка інстытута па ідэалагічнай рабоце і кадравым забеспячэнні палкоўнік міліцыі Дзмітрый ПАНУЖДАЕЎ.** Сам палкоўнік над аднаўленнем гісторыі міліцыі працуе ўжо не першы год. Як вынік гэтага — дзве напісаныя ў суаўтарстве кнігі, вялікі досвед работы з першакрыніцамі ў архівах.

Белых плям у гісторыі міліцыі ўсё яшчэ шмат. У тым ліку і па батальёне міліцыі.

— Не захавалася ніводнага дакумента, усё пакрыта легендамі. Толькі рэдкія супярэчлівыя ўспаміны і справаздача 7-й мюнхенскай пяхотнай дывізіі пра тое, што 21 ліпеня 1941 года ўзята добрае ўмацаванне рускіх, — расказвае **ваенны пісьменнік, краязнаўца, кіраўнік клуба ВІККРУ Мікалай БАРЫСЕНКА.** — Спісу асабістага складу батальёна міліцыі няма, паколькі міліцыянеры і супрацоўнікі НКУС былі засакрэчаныя. Батальён быў сфарміраваны 11 ліпеня 1941-га года па вусным загадзе начальніка Магілёўскага гарнізона палкоўніка Ваяводзіна ў дапамогу 172-й стралковай дывізіі, якая абараняла горад. Людзі былі зведзены ў адно падраздзяленне, часу знаёміцца ў іх не было. На сёння дакладна вядомыя імёны толькі 39 байцоў батальёна.

Пошукавікі не хаваюць расчаравання — спадзяванні на тое, што атрымаецца знайсці астанкі загінулых міліцыянераў, былі вялікія. А сведка ваенных часоў Мікалай Сляпнёў, які быў упэўнены на ўсе сто ў тым, што не памыляецца з месцам пахавання, нават плакаў. Але затрымлівацца болей чым на 4 дні ў 52-га спецыялізаванага батальёна, без якога нельга весці раскопкі, магчымасці не было. У іх і так кожны дзень распісаны па графіку. «З Магілёва едзем у Оршу, там у нас два аб'екты, а потым у іншыя месцы. І так па 31 кастрычніка», — паведаміў **старшы лейтэнант 52-га спецыялізаванага батальёна Дзмітрый КАМІНСКІ.**



Пошукавікам пашчасціла знайсці астанкі толькі аднаго байца.

Але нічога не бывае выпадковым, лічыць Дзмітрый Пануждаеў. «Для нас адкрыліся новыя абставіны, — кажа ён. — Магчыма, што адбылася памылка і пошукі трэба весці на суседняй вышыні. За 70 гадоў змяніўся рэльеф мясцовасці, і сёння цяжка казаць пра нешта з упэўненасцю. Мы будзем працягваць займацца пошукамі. Не выключана, што наступны раз нам болей пашчасціць».

Мікалай Барысенка таксама спадзяецца, што некаторыя таямніцы ў гісторыі з батальёнам міліцыі ўсё ж такі ўдасца рассакрэціць. Магчыма, пашчасціць здабыць нямецкі аэрафотаздымак вышыні на сярэдзіну ліпеня 41-га. Тады ўсё будзе зразумела. «Я ведаю дакладна, што ў амерыканскіх архівах такія здымкі ёсць. Каштуюць яны да 100 долараў, але, калі справа датычыцца захавання памяці, думаць пра грошы нават непрыстойна», — кажа гісторык.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*



Фота Мікалая БАРЫСЕНКІ.

Побач з пошукавікамі працавалі і курсанты Магілёўскага інстытута МУС.


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ТОРГАХ (в форме аукциона)

**Городокский районный исполнительный комитет Витебской области 9 июня 2017 года в 14.00 в здании Городокского райисполкома, расположенного по адресу: Витебская область, г. Городок, ул. Пролетарская, 2 (малый зал, каб. 110), проводит торги в форме аукциона на право заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства (длиннопалого (узкопалого) рака (Astacus leptodactylus) на территории следующих водных объектов Городокского района Витебской области:**

| Наименование водоема | Местонахождение, площадь, га | Промысловый запас, предельно допустимый объем изъятия рака | Начальная цена предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| озеро Берново | 22 км на северо-запад от г. Городка, дер. Вировля, 280,0 га | 1960 кг, 882 кг | 460 рублей (20 базовых величин) | 230 рублей (50% начальной цены предмета аукциона |
| озеро Первище-Среднее | 6 км на юг от г. Городка, дер. Малые Стайки, 61,0 га | 427 кг, 192 кг | 460 рублей (20 базовых величин) | 230 рублей (50% начальной цены предмета аукциона |
| озеро Залешно | 38 км на северо-восток от г. Городка, дер. Гуколы, 39,0 га | 273 кг, 123 кг | 460 рублей (20 базовых величин) | 230 рублей (50% начальной цены предмета аукциона |
| озеро Болецкое | 6 км на северо-восток от г. Городка, у дер. Новый Болецк, 26,0 га | 203 кг, 91 кг | 460 рублей (20 базовых величин) | 230 рублей (50% начальной цены предмета аукциона |
| озеро Черново | 13 км на северо-запад от г. Городка у дер. Лыска, 325,0 га | 5800 кг, 1300 кг | 460 рублей (20 базовых величин) | 230 рублей (50% начальной цены предмета аукциона |
| озеро Кашо | 4 км на северо-запад от г. Городка дер. Большое Кашо, 411,0 га | 7600 кг, 1700 кг | 460 рублей (20 базовых величин) | 230 рублей (50% начальной цены предмета аукциона |

* Примечание: оплата производится в белорусских рублях исходя из размера базовой величины, установленной на день оплаты.

Организатор – Городокский районный исполнительный комитет, 211573, Витебская область, г. Городок, ул. Пролетарская, 2, контактный телефон 8(02139)43105, факс (802139)41005.

Для участия в аукционе приглашаются юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь.

Участникам необходимо в адрес организатора предоставить:

заявление с указанием, на какой территории и какие виды диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, предполагается заготавливать и (или) закупать по результатам торгов;

копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий счет организатора аукциона, заверенную банком;

юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателям, – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

представителям юридических лиц или индивидуальных предпринимателей предоставить доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя, а руководителям юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

Документы, необходимые для участия в аукционе, принимаются организатором аукциона по адресу: 211573, Витебская область, г. Городок, ул. Пролетарская, 2, каб. 205, 109 (с 8.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00 по рабочим дням: понедельник–пятница).

Последний день приема документов – 5 июня 2017 года до 17.00.

Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет ГУ Министерства финансов Республики Беларусь по Витебской области №3600316007107 в филиале №200 Витебского облуправления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 150801635, УНП 300594330, код платежа в бюджет 04005. Порядок внесения задатка – единовременно.

Аукцион проводится в соответствии с Правилами добычи, заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, утвержденных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 2 июня 2006 г. №699.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Задатки участникам, не ставшим победителями, возвращаются в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Участнику, выигравшему торги, сумма внесенного задатка учитывается в счет возмещения затрат на организацию и проведение торгов, изготовление документации необходимой для их проведения.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявка (заявление) на участие в нем подана только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведение аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан:

подписать протокол аукциона;

не позднее 10 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, а также оплатить приобретаемый предмет аукциона путем перечисления денежных средств на расчетный счет организатора аукциона до принятия решения Городокского районного Совета депутатов.

Для участника, ставшего победителем аукциона, при осуществлении заготовки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства (длиннопалого (узкопалого) рака, способом добычи диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства (длиннопалого (узкопалого) рака), является только использование раколовок как орудия добычи таких животных.


## Віншаванні да свята

# Адпраўце вестачку ветэрану

Акцыю да Дня Перамогі запусціла «Белпошта»

**Ахвотныя змогуць падпісаць паштовыя карткі ў адрас ветэранаў са словамі ўдзячнасці. На бланках ужо пазначаны прозвішчы і месцы жыхарства былых байцоў. Святочныя вестачкі з віншаваннямі супрацоўнікі «Белпошты» даставяць ветэранам бясплатна.**

Прамамерапрыемства пройдзе ў выдзеленых аддзяленнях сувязі па ўсёй рэспубліцы. У Мінску акцыя адбудзецца 5 мая з 15.00 да 16.00. У гэты ж дзень святочныя карткі можна будзе падпісаць у аддзяленнях Гродзенскага філіяла (з 10.00 да 13.00), Віцебскага (з 11.00 да 12.00), Магілёўскай і Мінскай абласцей (з 14.00 да 15.00), у Гомелі (на вул. Савецкая, 8, з 14.00 да 15.00). Наведвальнікам Брэсцкага філіяла пошты далучыцца да віншаванняў прапануюць 6 мая з 10.30 да 12.30. Больш падрабязна пра месцы правядзення акцыі можна даведацца на сайце прадпрыемства і ў аддзяленнях сувязі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

## Фінансы

# Пазычыць стане прасцей?

Рэгулятар дазволіў банкам выдаваць крэдыты без даведкі аб даходах

**Менавіта з першых дзён мая ўжо больш не дзейнічае пастанова Праўлення Нацыянальнага банка краіны №253, якая забараняла фінансавым інстытутам крэдытаваць фізічных асоб без дакумента, які пацвярджае атрыманне даходу. Нацбанк не стаў працягваць тэрміны дзеяння гэтага дакумента, таму цяпер банкі самастойна вызначаюць падыходы да ацэнкі крэдытаздольнасці сваіх кліентаў.**

**Слушны каментарый ад фінансавых аналітыкаў кампаніі ТэлетрэйдБел:**

— Спажывецкае крэдытаванне дапамагае аднаўленню ўнутранага попыту, які, у сваю чаргу, з'яўляецца адным з рухавікоў эканамічнага росту. Таму такая мера рэгулятара можа спрыяць паляпшэнню дынамікі ВУП Беларусі. Хутчэй за ўсё, цяпер зноў стануць папулярнымі так званыя крэдыты на тавары, якія выдаюцца непасрэдна ў крамах на буйныя пакупкі. Адсутнасць папяровай цяганіны разам са зніжэннем працэнтных ставак па крэдытах падштурхне попыт беларусаў на дарагія тавары. Акрамя таго, адмена абавязковых даведак аб даходах выдатна ўпісваецца ў агульную карціну лібералізацыі фінансавага рынку Беларусі, якая назіраецца апошнім часам, і пашырае магчымасці банкаў па развіцці дыстанцыйнага банкінгу.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*


Белгазпромбанк
Энергия твоего будущего!

## ОТЧЕТ О ПРОВЕДЕНИИ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ПОКУПКА УДАЧИ»

**Место и дата составления отчета:**
03.05.2017 г.
г. Минск, пр. Независимости, 11/2, офис 328

1. Организатор: Общество с ограниченной ответственностью «ТриВижн» (далее Организатор), 220030, г. Минск, пр. Независимости, 11/2, офис 328, УНП 190624910.
2. Наименование рекламной игры – «Покупка Удачи».
3. Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры №2921, выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь от 25.01.2017 г.
4. Срок начала рекламной игры: 01 февраля 2017 г.
Срок окончания рекламной игры: 19 мая 2017 г.
5. Количество участников рекламной игры: 4 328 человек.
6. Розыгрыш проводился 10.04.2017 г. в 10.00 по адресу: РУП «Отель «Минск», г. Минск, пр. Независимости, 11/2, конференц-зал, в присутствии утвержденной комиссии из пяти человек:

Председатель Комиссии: Носик Дмитрий Викторович, директор ООО «ТриВижн».

Члены комиссии:

Алехно Наталья Вячеславовна, заместитель директора ООО «ТриВижн»;

Лешко Диана Валерьяновна, юрисконсульт ООО «ТриВижн»;

Врублевская Ольга Александровна, главный бухгалтер ООО «ТриВижн»;

Суходолова Татьяна Михайловна, главный специалист Управления информационной политики ОАО «Белгазпромбанк».

7. Призовой фонд рекламной игры «Покупка Удачи» состоял из:

| № п/п | Наименование призов, участвующих в розыгрыше | Сумма за 1 ед., бел. руб. | Сумма всего, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Автомобиль SKODA RAPID ACTIVE 1.6MPi/66 kW, седан, Белый, кузов №XW8AG1NH9HK108271 | 20 043,4 | 23 023,60 |
| | Денежное вознаграждение | 2 980,20 | |
| 2 | Автомобиль SKODA RAPID ACTIVE 1.6MPi/66 kW, седан, Белый, кузов №XW8AG1NH0HK104366 | 20 043,4 | 23 023,60 |
| | Денежное вознаграждение | 2 980,20 | |

Призовой фонд разыгран полностью.

8. Победители рекламной игры:

**1. Корончик Ольга Николаевна, г. Волковыск.** Выигрыш: Автомобиль SKODA RAPID ACTIVE 1.6MPi/66 kW, седан, Белый, кузов №XW8AG1NH9HK108271 – 1 шт. и денежное вознаграждение в размере – 2 980,20 белорусского рубля. Дата выдачи выигрыша 20.04.2017 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2;

**2. Володина Наталья Владимировна, г. Могилев.** Выигрыш: Автомобиль SKODA RAPID ACTIVE 1.6MPi/66 kW, седан, Белый, кузов №XW8AG1NH0HK104366 – 1 шт. и денежное вознаграждение в размере – 2 980,20 белорусского рубля. Дата выдачи выигрыша 20.04.2017 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2.

9. Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры: +375 17 209-90-03.

10. В ходе проведения рекламной игры нарушений допущено не было. Жалоб организатору и комиссии не поступало.



Утерянную зачетную книжку БГАТУ №1208004 Виталева Д.В. считать недействительной.

■ Ёсць нагода

# ДЗЕЦІ «ПАРТЫЗАНФІЛЬМА»

**Некаторыя беларускія фільмы пра Вялікую Айчынную незалежна ад даты вытворчасці, што называецца, ва ўсіх на слыху — «Альпійская балада», «Ідзі і глядзі», «У жніўні 44-га», «Брэсцкая крэпасць»... Але напярэдадні Дня Перамогі «Звязда» прыгадала шэсць іншых кінастужак вытворчасці кінастудыі «Беларусьфільм». Сярод іх ёсць і шэдэўры, і творчыя няўдачы, і незаслужана забытыя сучаснікамі карціны, — але ўсе яны без выключэння адзначаюць сёлета круглыя даты.**

## 10 гадоў
### «ВОРАГІ»

Дэбютная стужка выпускніцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Марыі Мажар, знятая пад кіраўніцтвам вядомага рэжысёра і прадзюсара Аляксея Учыцеля, з аднаго боку, атрымала нямала крытыкі за адсутнасць гісторыка-ваеннага кансультанта і — як вынік — сюжэтную неахайнасць, фактычныя памылкі і недакладнасці, а з другога, на «Лістападзе-2007» усё ж была адзначана спецыяльным дыпломам журы «За вернасць традыцыям



і новы погляд на вайну» і прызам «Разам» за найлепшы сумесны беларуска-расійскі праект. А яшчэ — Гран-пры X адкрытага Бярдзянскага фестывалю «Брыганціна», прыз «Залатога Віцязя» за сцэнарый, дыплом за найлепшы дэбют у кіно на 6-м Рэспубліканскім фестывалі беларускіх фільмаў і дыплом на 5-м кінафестывалі «Слаўся, Айчына». І хоць да драматургіі і маральнага пасылу фільма, як адзначала ў тым ліку і «Звязда», ёсць пытанні, станоўчых водгукаў гледачоў стужка сабрала таксама нямала.

У цэнтры сюжэта, нагадаем, — жыхары беларускай вёскі на акупаванай немцамі тэрыторыі, якія вымушаны суіснаваць з ворагамі ў прамым сэнсе пад адным дахам. 10-гадовага сына сялянкі Наталлі фашысты арыштоўваюць нібыта за спробу падарваць чыгунку і сувязь з партызанамі. Маці ў адчаі ўгаворвае каменданта вёскі Ота, які жыве ў яе хаце, адпусціць хлопчыка, аднак той прапаноўвае іншае выйсце — прывесці на замену другое дзіця. Але нават дзеля выратавання адзінага сына Наталля не здолела здзейсніць такі ўчынак...

Яшчэ дзве прэм'еры 2007 года — фільмы **«Радзіма альбо смерць» Алы Крыніцынай** (гісторыя пра падлеткаў-дыверсантаў, завербаваных фашыстамі з ліку дзяцей «ворагаў народа») і **«Чаклун і Румба» Андрэя Голубева** (чарговае супрацьпастаўленне «герояў» і сапраўдных герояў, аформленае як гісторыя кахання ва ўмовах вайны). Абедзве карціны крытыкі прызналі вельмі слабымі нават для дэбютных работ — што, зрэшты, не перашкаджае тэлеканалам перыядычна паказваць іх, а аўдыторыі, якой фільмы прыйшліся даспадобы, — глядзець. Дарэчы, у ахвотных такая магчымасць будзе і на наступным тыдні: «Радзіму або смерць» пакажа 8 мая «Беларусь 3».

## 25 гадоў
### «ПАЙСЦІ І НЕ ВЯРНУЦЦА»

Рэжысёр Мікалай Князеў рабіў гэты фільм паводле аднайменнай аповесці Васіля Быкава спецыяльна для тэлебачання,



пры падтрымцы «Беларусьфільма» і «Астанкіна», у 1992 годзе. Юную партызанку Зосю тут іграе актрыса-тэлевядучая-кулінарка Юлія Высоцкая, а Антона Галубіна, гатовага выдаць фашыстам і ўпадабаную дзяўчыну, і наогул увесь партызанскі атрад, каб толькі жыць у адносным спакоі і бяспецы, — расійскі акцёр Ігар Шуць. Перакануача паказаць страшную стомленасць ад ваенных нягод і маральных пакут, барацьбу паміж сумленнем і блізкай да цела ўласнай кашуляй фільм не здолеў, а таму прайшоў гледачамі і крытыкай амаль цалкам не заўважаным.

Адзначым, дзеля справядлівасці, што гэта спроба экранізацыі твора Быкава была не першай і не апошняй. Так, у 1987 годзе Ленінградскае тэлебачанне прадставіла гледачам двухсерыйны тэлефільм «Пайсці і не вярнуцца», а ў 2004-м на «Беларусьфільме» малады выпускнік майстэрні Міхаіла Пташука рэжысёр Яўген Сяцько зняў дыпломную кароткаметражную стужку з выключна беларускімі акцёрамі — Юліяй Кадушкевіч, Кірылам Захаравым, Сяргеем Жураўлём, Аляксандрам Кашперавым, Георгіем Маляўскім.

## 30 гадоў
### «ПЕРАПРАВА»

Ваенная драма сумеснай вытворчасці СССР і Польшчы, знятая рэжысёрам Віктарам Туравым, пераносіць гледачоў у вясну



1944 года, калі на акупаванай тэрыторыі Польшчы супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў дзейнічалі адначасова групоўкі байцоў польскага Супраціўлення і савецкія партызанскія атрады. Калі нямецкае камандаванне вырашыла пакончыць з партызанамі і загадала блакіраваць Яноўскія лясы, савецкія партызаны адбілі першую атаку і прапанавалі кіраўніку Арміі Краёвай Бжэзіне план агульнага выйсця з акружэння. Аднак польскія вайскоўцы не пагадзіліся на прапанову саюзнікаў і загінулі ў няроўным баі, спрабуючы прарваць блакаду...

Фільм, у якім быў заняты інтэрнацыянальны акцёрскі ансамбль — Інгеборга Дапкунайце, Аляксандра Якаўлева, Пётр Юрчанкоў-старэйшы, Барыс Няўзораў, Павел Кармунін ды іншыя, дарэчы, існаваў у дзвюх версіях: чатырохсерыйнай — для тэлебачання (у СССР ішоў пад назвай «Чырвоны колер папараці»), і двухсерыйнай — для кіно. Цікавая дэталь: у свой час за гэту карціну Віктар Тураў атрымаў медаль дружбы і прэмію ад Міністэрства абароны Польшчы.

## 40 гадоў
### «ЧОРНАЯ БЯРОЗА»

...Лейтэнант Андрэй Хмара пасля кантузіі ў танкавым баі пад Мінскам трапляе ў партызанскі лагер, дзе ўрач Антаніна Іванаўна выратоўвае яго, робячы аперацыю. А ўжо ў жніўні 1941-га яе расстрэльваюць фашысты, і пра тое, што яе маленькі сын застаўся сіратой, Андрэй даведваецца ўжо ў канцы вайны. Вярнуўшыся дадому, ён удзельнічае ў аднаўленні мірнага жыцця: заняты з былымі саслужыўцамі на будоўлі завода, жэніцца, усынаўляе асірацелых дзяцей і пачынае пошукі Васілька — сына сваёй ратавальніцы.



Адметна, што сюжэт фільма часткова заснаваны на рэальных падзеях: у ліпені 1941 года ва ўжо захоплены Мінск уварваўся «шалёны» савецкі танк Т-28, які прамчаўся праз горад, раўнаючы з зямлёй нямецкіх салдат, цягачы і грузавікі, і быў падбіты толькі на ўсходняй ускраіне сталіцы. Дваім членам экіпажа ўдалося пакінуць палаючую машыну; пазней за гераічны ўчынак механік-кіроўца танка, старэйшы сяржант Дзмітрый Мально, атрымаў ордэн Айчыннай вайны I ступені.

Двухсерыйная карціна пачынальніка рэжысёрскай дынастыі Віталя Чацверыкова ўвайшла ў спіс лідараў кінапракату 1978 года — у СССР яе паглядзелі звыш 33 мільёнаў гледачоў, ухваляючы рэжысёра як за відовішчныя баталіі і рэалізм партызанскага быту, так і за майстэрскую перадачу глыбіні чалавечых пачуццяў. Між іншым, строгая цэнзура не выразала з фільма эратычную сцэну з Ірынай Алфёравай — палічыўшы, што здымалася яна не дзеля эротыкі самой па сабе, а дзеля супрацьпастаўлення жаночага характва зверствам фашызму.

## 45 гадоў
### «ЗІМАРОДАК»

Адзначаны ў 1973 годзе прызам ЦК ВЛКСМ «Пунсовы гваздзік» за найлепшы фільм для дзяцей, рэжысёр Вячаслаў Нікіфараў зняў вельмі своечасовую стужку пра сувязь пакаленняў, такую важную для ўнукаў і праўнукаў герояў. Аднайменнай аповесцю Юрыя Якаўлева, надрукаванай



у часопісе «Піянер», нездарма зачытваліся сотні тысяч савецкіх дзяцей. Паводле слоў рэжысёра, пісьменніку ўдалося галоўнае — «не апісаць падзеі, а захаваць рамантычнасць, адчуванне цудоўнасці быцця, уласцівага гэтаму ўзросту».

Так, успаміны былога франтавіка-лётчыка пра подзвіг маладога партызана па мянушцы Зімародак, які цаной свайго жыцця падарваў мост на занятай ворагам тэрыторыі, падштурхнулі школьнікаў даведацца больш пра лёс героя. А няпростыя і цікавыя, амаль дэтэктыўныя пошукі прывялі падлеткаў... да іх любімага настаўніка біялогіі, здольнага і ў сталым узросце скакаць па парэнчах і атрымаць за гэта вымову ад дырэктара школы...

Дарэчы, акцёр Уладзімір Самойлаў расказваў, што менавіта з-за гэтага эпізоду ён, ужо вядомы па «Вяселлі ў Малінаўцы», і пагадзіўся на ролю сціплага настаўніка. Але поруч з масцітымі акцёрамі — Самойлавым, Глебам Стрыжэнавым, Аўгусцінам Мілаванавым — у кадры арганічна выглядалі і дзеці, набраныя ў кіно ледзьве не з вуліцы, і жывёлы-насельнікі кабінета біялогіі: гаваркі папугай, малпа Яша і ўдаў, задачай якога было проста поўзаць усюды. Яшчэ адзін складальнік — кранальная да дрыжыкаў песня *«Зимородок — это вовсе не птица, это сердце мальчишки, взлетевшее ввысь»*, што імгненна стала папулярнай і доўгі час выконвалася дзіцячымі калектывамі.

## 50 гадоў
### «ВАЙНА ПАД СТРЭХАМІ»

Першы фільм дылогіі, знятай Віктарам Туравым паводле рамана Алеся Адамовіча «Партызаны» (другая частка «Сыны ідуць у бой» выйшла на два гады пазней).

...У акупаваным нямецка-фашысцкімі захопнікамі прыгранічным беларускім гарадку працягваецца сваё жыццё — і свая барацьба. Загадчыца аптэкі Ганна Корзун, штодня рызыкуючы жыццём, выходзіць на сувязь з партызанамі і перадае ім свежую інфармацыю і медыкаменты. Калі ж справа аказваецца пад пагрозай зрыву, жанчына разам з сынамі ідзе ў лес, у партызанскі атрад...



Чорна-белы, пранізлівы, строгі фільм. Менавіта такім яго ўбачылі гледачы — у тым ліку і будучы знакаміты рэжысёр Стывен Спілберг, якога работа савецких кінематаграфістаў натхніла на здымкі «Спіса Шындлера».

Многія памятаюць, што ў карціне гучаць песні Уладзіміра Высоцкага. У пачатковым варыянце іх было тры: «Буслы», «Песня пра новы час» і «У нас учора з пазаўчора», але да выхаду на шырокі экран у 1971-м засталіся толькі дзве першыя. Высоцкі ёсць і ў кадры «Вайны пад стрэхамі» — у адным з эпізодаў працягласцю секундаў на 30 акцёр у форме паліцая ледзь пазнавальны ў масоўцы. Па некаторых звестках, роля была большай, аднак цэнзура пастаралася — нездарма ж з вытворчасці да гледача карціна ішла доўгія чатыры гады...

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

**Фота belarusfilm.by і з адкрытых крыніц**

■




## Аўторак, 9 мая

### Беларусь 1

**6.55** Гумар на вайне.
**7.50, 9.10, 11.10 Драма «Перакладчык». 1—2-я серыі.*****
**9.00, 11.00, 15.00, 18.00** Навіны.
**12.00** Ускладанне кветак і вянкоў да манумента Перамогі ў г. Мінску ў рамках акцыі «Беларусь памятае!»
**13.00 Драма «Бітва за Севастопаль».***
**15.20 Серыял «Сваты-6».**
**16.25, 18.15 Драма «А золкі тут ціхія...»***
**17.55** Хвіліна маўчання. Светлай памяці загінулых у барацьбе супраць фашызму.
**20.30** Панарама.
**21.30** Урачысты тэатралізаваны канцэрт майстроў мастацтваў «Плошча Перамогі».
**23.00** Міжнародны конкурс песні «Еўрабачанне-2017». Першы паўфінал.
**1.00** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.10, 10.05, 14.40** «Партызаны». Дак. цыкл.
**8.00, 21.30** Тэлебарометр.
**8.05 Камедыя «Пяць нявест».***
**10.30 Дэтэктыў «Ялта-45». 1—4-я серыі.*****
**15.05 Анімацыйны фільм «Валіянт».**
**16.25, 23.50** «Жывая гісторыя». Дак. фільм.
**17.10, 18.00** Хакей. Чэмпіянат свету. Італія — Латвія.
**17.55** Хвіліна маўчання. Светлай памяці загінулых у барацьбе супраць фашызму.
**19.25 Маст. фільм «Вышыня 89».***
**21.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Паўфінал. «Ювентус» (Італія) — «Манака» (Францыя). Матч у адказ. У перапынку: Спартлато 6 з 49, КЕНО.

### Беларусь 3

**7.25, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**7.40, 20.15, 23.30** «Гэты дзень».
**7.45** «Дзённікі беларускага падполля». Мінск.
**8.15** «Яны спявалі за Радзіму».
**8.40, 23.10** «З днём народжання, Перамога!» Вакальны цыкл Леаніда Захлеўнага ў выкананні ансамбля «Бяседа».
**9.00, 21.40 «У бой ідуць адны «старыя». Драма.***
**10.30** Гала-канцэрт XX Тэлевізійнага фестывалю армейскай песні «Звязда».
**12.10 «Снайпер. Зброя помсты». Баявік. 1—4-я серыі.***
**15.15, 21.05** «Берлін. Май 1945-га». Дак. фільм. Частка другая.*
**16.00 «Сляды апосталаў». Маст. фільм. 1—4-я серыі.***
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.20** «Грані Перамогі». «Дзень Перамогі». Частка першая.
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**7.30** PRO спорт. Вынікі тыдня.
**8.10** Хакей. Чэмпіянат свету. ЗША — Швецыя.
**10.05** Хакей. Чэмпіянат свету. Беларусь — Канада.
**12.00, 23.25** Хакей. Чэмпіянат свету. Агляд гульнявога дня.
**12.30** Спорт-кадр.
**13.00** Тэніс. Турнір WTA. Мадрыд.
**17.05** Хакей. Чэмпіянат свету. Славенія — Нарвегія. (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**19.20** Хакей. Чэмпіянат свету. Італія — Латвія.
**21.05** Хакей. Чэмпіянат свету. Швейцарыя — Францыя. (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**23.55** Хакей. Чэмпіянат свету. Славакія — Данія.

### АНТ

**7.00, 8.05** «Наша раніца».
**8.00** (з субцітрамі), **13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**9.05 Трагікамедыя «Жэня, Женечка і «Кацюша».***
**10.40** «Мая лінія фронту».
**12.00** Ускладанне кветак і вянкоў да манумента Перамогі ў г. Мінску ў рамках акцыі «Беларусь памятае!»
**13.15** Канцэрт, прысвечаны юбілею фільма «Афіцэры» ў Крамлёўскім Палацы.
**14.15 Легендарнае кіно. Маст. фільм «Афіцэры».**
**16.20 Легендарнае кіно ў колеры. Маст. фільм «У бой ідуць адны «старыя».***
**17.55** Хвіліна маўчання. Светлай памяці загінулых у барацьбе супраць фашызму.
**18.20** «Бессмяротны полк».
**21.00** «Дваццаць восем панфілаўцаў».*
**23.00** «Будзем жыць!» Урачысты канцэрт да Дня Перамогі.

### СТБ

**6.00 Маст. фільм «Аты-баты, ішлі салдаты...»***
**7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**7.40 Маст. фільм «Экіпаж машыны баявой».***
**8.50, 0.00 Маст. фільм «Балада пра салдата».***
**10.40, 13.00 Драма «Дняпроўскі рубеж».*****
**12.00** Ускладанне кветак і вянкоў да манумента Перамогі ў г. Мінску ў рамках акцыі «Беларусь памятае!»
**13.50 Маст. фільм «Афіцэры»***
**15.35, 16.50, 18.00, 20.10, 23.00 «Замах». Серыял.**
**17.55** Хвіліна маўчання. Светлай памяці загінулых у барацьбе супраць фашызму.
**19.10** «Аўтапанарама». Святочны выпуск.
**20.00** «СТБ-спорт».

### МІР

**6.00** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**7.45 Маст. фільм «Ляцяць жураўлі».***
**9.30, 14.55, 16.00, 19.00, 21.55** Навіны (бягучы радок).
**10.00** Ваенны парад, прысвечаны 72-й гадавіне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Масква.
**11.00** «Беларусь памятае!» Шэсце. Трансляцыя з Мінска.*
**11.25** «Шчыт садружнасці. 25 гадоў калектыўнай бяспекі: ад дагавора да арганізацыі».***
**12.10, 2.40 Маст. фільм «Беларускі вакзал».***
**13.45, 15.15, 16.15, 19.15 Маст. фільм «Гардэмарыны, наперад!»***
**15.00** Трансляцыя «Бессмяротны полк».
**18.55** Светлай памяці загінулых у барацьбе супраць фашызму. Хвіліна маўчання.
**19.45, 22.10 Маст. фільм «Віват, гардэмарыны!»***
**22.00** Дзень Перамогі. Святочны салют.
**22.25 Маст. фільм «Гардэмарыны-3».***
**0.20 Маст. фільм «Тры дні ў Адэсе».***
**4.15** «Любімыя акцёры 2.0».*
**4.35 Маст. фільм «Адзінокім даецца інтэрнат».***

### РТР—Беларусь

**7.00, 11.00** «Дзень Перамогі». Святочны канал.
**10.00** Масква. Красная плошча. Ваенны парад, прысвечаны 72-й гадавіне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.
**11.45 Маст. фільм «Апошні рубеж».***
**13.50, 18.00, 19.50, 23.30** Навіны — Беларусь.
**14.00, 20.00** Весткі.
**15.00** «Бессмяротны полк». Шэсце ў гонар 72-й гадавіны Вялікай Перамогі.
**18.10, 19.00, 20.35 Маст. фільм «Сталінград».***
**18.55** «Светлай памяці загінулых у барацьбе супраць фашызму».
**21.35** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**21.55** Весткі. Спецыяльны выпуск.
**22.00, 23.10** Святочны салют, прысвечаны Дню Перамогі.
**22.15, 23.40** Святочны канцэрт, прысвечаны Дню Перамогі.
**0.20** «Ордэны Вялікай Перамогі».

### НТБ—Беларусь

**5.45** «Астрапрагноз».
**5.50** «Вызваліцелі».*
**6.30** «Шлях да Перамогі».***
**7.20, 8.10 Драма «Брэсцкая крэпасць».****
**8.00, 19.00** Сёння.
**10.00** Масква. Красная плошча. Парад, прысвечаны Дню Перамогі.
**11.00** «Песні Перамогі». Святочны канцэрт.*
**12.00** Ускладанне кветак і вянкоў да манумента Перамогі ў г. Мінску ў рамках акцыі «Беларусь памятае!»
**12.45 Драма «Дняпроўскі рубеж».*****
**15.00, 18.00 Драма «Ордэн».***
**17.55** Хвіліна маўчання. Светлай памяці загінулых у барацьбе супраць фашызму.
**18.10, 19.35 Дэтэктыў «Белая ноч».*****
**22.00 Маст. фільм «У жніўні 44-га...»*****
**23.55** Канцэрт Ансамбля песні і танца Расійскай Арміі імя А.В. Аляксандрава на Паклоннай гары.*

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**8.00 Серыял «Чатыры танкісты і сабака».**
**9.00, 18.00 Серыял «Гранд гатэль».**
**10.15 «Сябры дзядулі Марка».**
**10.30** «Мой любімы гадаванец».
**11.00 Драма «Перагон».**
**13.20 Серыял «Легенды».**
**14.45 Серыял «Палацавыя тайны».**
**15.55, 19.10, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** «Мультпарад».
**16.40 Серыял «Доўгая дарога ў дзюнах».**
**19.15 Серыял «Імперыя».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.15 Драма «Бітва за горад».**
**23.15 Серыял «Футбалісты».**

## КАЛАСАВІКОЎ ЦЬМА ЦЬМУШЧАЯ

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» гульня «Размаўляем па-беларуску». Для таго каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**ланіты (устарэлае)** — шчокі;
**макаўка (размоўнае)** — купал царквы;
**цурка** — тонкі аскепак трэскі, палкі;
**каласавік** — баравік, які расце ў час каласавання жыта. *«Жоўтагаловыя каласавікі — грыбы нядоўгія», — чытаем у Івана Навуменкі;*
**кажамяка (устарэлае)** — майстар, які вырабляе сырамятныя скуры;
**казальніца (устарэлае)** — узвышэнне ў царкве перад іканастасам;
**ад гаршка паўвяршка** — вельмі нізкі, маленькі ростам. Беларусы яшчэ скажуць: жабе па калена, з вузел, кату па пяту. Рускія: аршин с шапкой;
**цьма цьмушчая** — вялікая, незлічоная колькасць нечага ці некага. Беларускія сінонімы: без меры, канца краю не відаць, праз горла лезе. Рускі адпаведнік: конца-краю нет.

**Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

### ВТБ

**6.00** Скетч-шоу «6 кадраў».***
**7.00, 2.30** «Ералаш».
**8.30, 3.00** М/ф «Тры каты».0
**8.50, 3.20** М/ф «Смяшарыкі».0
**9.10, 3.40** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**9.30** Анімацыйны фільм «Як прыручыць дракона».0
**11.20** Камедыя «Пяць нявест».*
**15.10** Анімацыйны фільм «Лясная братва».*
**16.50, 18.50** «Уральскія пельмені».***
**20.30** Фантастыка «Туман».*
**23.00** Фантастыка «Туман-2».*
**1.50** «Турбаміксер».***
**4.00** «Лаві момант».***
**5.00** «Дурні і дарогі».***

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Чыстая перамога. Штурм Новарасійска».
**10.45** «Чыстая перамога. Бітва за Эльбрус».
**11.25** «Чыстая перамога. Бітва за Берлін».
**12.10** «Застава Ільіча». Маст. фільм.
**15.20** «Ліпеньскі дождж». Маст. фільм.
**17.05** «Быў месяц май». Маст. фільм.
**18.55** «Светлай памяці загінулых у барацьбе супраць фашызму».
**19.00** Сяргей Шакураў у праекце «Рускі характар».
**20.40** Да 110-годдзя з дня нараджэння Васіля Салаўёва-Сядога. Вечар у Тэатры мюзікла.
**22.15** «Нябесны ціхаход». Маст. фільм.
**23.30** «Зялёная планета». Дак. фільм.
**1.05** «Шукальнікі». «Куфар імператрыцы».
**1.50** «Каміль Пісаро». Дак. фільм.
**1.55** «Сцюардэса». Маст. фільм.
**2.35** «Да Поўдня ад Поўначы». «Канфлікт». М/ф для дарослых.

### Настальгія

**6.00** Маст. фільм «Дом, які пабудаваў Свіфт».*
**8.20** Канцэрт гуртоў «Машина времени» і «Цветы».***
**9.25** Маст. фільм «Начныя забавы».***
**11.40, 14.15, 15.40, 17.00, 20.45, 21.40, 2.50, 5.30** Музычная настальгія.*
**12.00, 19.40** Маст. фільм «Месца сустрэчы змяніць нельга».***
**15.00, 21.00** «Мінулы час».*
**16.00, 22.00** «Народжаны ў СССР».*
**23.00** «Песня-80». 1-е аддзяленне.*
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1979. 2-я частка. 2009 год.***
**1.25** «Песня-79». 2-е аддзяленне.*
**2.25** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Аркадзь Райкін. 1996 год.***
**3.00** «Быў час». 2009 год.***
**4.00** Маст. фільм «Жывое такі хлопец».***

### EuroSport 1

**4.00** Watts.
**4.30, 7.00, 11.00, 1.30** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**5.00, 7.30, 11.30, 2.00** Футбол. «ФІФА».
**5.30, 9.30, 13.00, 14.15, 16.45, 22.00, 0.30, 2.30** Веласпорт. «Джыра д'Італія».
**10.55, 21.55** Зімовыя віды спорту. «У пагоні за гісторыяй».
**12.00, 21.00** Тэніс. Турнір АТР. Фінал.
**14.00, 18.15** Веласпорт. «Джыра-экстра».
**18.30** Футбол. Юнацкі чэмпіянат Еўропы (U-17).
**20.30** «Найлепшае з коннага спорту».
**23.00** Аўтагонкі. Этап чэмпіянату свету па гонках на вынослівасць.
**23.30** Ралі. ERC.
**0.00** Аўтагонкі. Серыя Blancpain.

### Кінакамедыя

**0.50** Камедыя «Правілы жыцця французскага хлопца».***
**2.30** Камедыя «Вампіркі».***
**4.05** «Камедыянты (Шоу)» ***
**4.40, 15.35** Скетчкам «Паміж намі».***
**5.00** Меладрама «Як займацца каханнем па-англійску».****
**6.45** Меладрама «Былыя: найлепшыя сябры!»***
**8.30** Камедыя «Сакрэты сексу і кахання».****
**10.20** Камедыя «Прышэльцы ў Амерыцы» .0
**12.00** Камедыя «Прышэльцы-3: узяцце Бастыліі».*
**14.00** Камедыя «Уніз па лесвіцы».***
**16.15** Камедыя «Да чорта на рогі».***
**17.55** Меладрама «Хочаш ці не?»***
**19.30** Камедыя «Прышэлец з космасу».***
**21.10** Меладрама «Каралеўства поўнага месяца».***
**22.50** Камедыя «Кароль вечарынак».***

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.15** «Жывёлы на вайне». Дак. фільм.
**10.00** «У бой ідуць адны «старыя». Драма.*
**11.45** «Смага». Драма.***
**15.00** «Песні ваенных гадоў». Дак. фільм.
**16.30** «Мы з будучыні». Драма.***
**20.00, 2.50** «Снег і попел». Маст. фільм.***
**23.25** «Англійскі пацыент». Драма.***
**2.05** «Звышнатуральнае». Серыял.

### ТБ1000

**6.10, 18.05** Сэрца дракона.*
**8.10** Не ў сабе.***
**10.30** Піяніст.***
**13.25** Секс па дружбе.***
**15.40** Адкупленне.***
**20.10** Гладыятар.*
**23.10** Спадар Ніхто.*
**1.55** Кастрычніцкае неба.*
**3.55** Прабач за каханне.***

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Зязюля.***
**8.30** Я — настаўнік. Хатняя вайна, або Змоўшчыкі.*
**10.20** У далёкім сорак пятым... Сустрэчы на Эльбе.****
**12.20** Рызыка.
**14.20** Цэль бачу.***
**16.20** Буду помніць.***
**18.20** Лейтэнант.*
**20.20** Перакладчык.*
**0.20** Забарона.***
**2.20** Я — настаўнік. Хатняя вайна, або Змоўшчыкі.*
**4.20** Граф Мантэнегра.*

### National Geographic

**6.00** Навуковыя недарэчнасці.*
**8.10, 10.25, 11.55** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.*
**12.40** Нападзенне нацыстаў на ЗША.***
**13.25, 15.45, 17.15** Другая сусветная вайна: Пекла пад вадой.***
**18.00, 20.25, 22.00** Апакаліпсіс. Другая сусветная вайна.***
**22.50** Праслухоўка арміі Гітлера.***
**23.35, 4.15** Геній.***
**0.25, 2.45** Расследаванні авіякатастроф.*
**1.10** Гульні розуму.*
**2.00, 5.10** Пачатак.*

### Discovery

**8.00, 14.00, 0.00, 3.50** Выжыць любой цаной.*
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?*
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?*
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі.*
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Паляўнічыя на склады.***
**11.00** Фабрыка ўнікальных аўто.*
**17.00, 22.00, 6.20** Махінатары.*
**18.00** Узрываючы гісторыю.
**1.00, 2.55** Унікальныя тачкі.*
**2.00** Геній аўтадызайну.*
**4.40** Маланкавыя катастрофы.***

■ «Еўрабачанне-2017»

## NAVIBAND ПАПЛЫВУЦЬ ПА СЦЭНЕ

**Беларускія артысты правялі першую рэпетыцыю на конкурснай пляцоўцы. За 30 хвілін музыканты, харэограф і рэжысёр прымерыліся да сцэны кіеўскага Міжнароднага выставачнага цэнтра, дзе на наступным тыдні і стартуе сёлетняе песеннае шоу.**



Традыцыйна першая рэпетыцыя «Еўрабачання» — не касцюмаваная, затое арганізатары і прэса ўбачылі канцэпцыю нумара беларусаў. Аказваецца, Арцём Лук'яненка і Ксенія Жук з песняй «Гісторыя майго жыцця» будуць ці то плыць, ці то ляцець над сцэнай на адмысловым чоўне — трохметровай платформе. Ілюзію руху дапамогуць ствараць спецэфекты і правільна падабраны рэжысёрамі ракурс.

Заўтра ў артыстаў запланавана другая індывідуальная рэпетыцыя і вялікая прэс-канферэнцыя, а само конкурснае выступленне, нагадаем, адбудзецца 11 мая пад нумарам 14 у другім паўфінале «Еўрабачання».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
*tselyashuk@zviazda.by*

■

## Серада, 10 мая

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.25, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 16.50, 23.40** Зона Х.
**9.10, 10.05 Драма «А золкі тут ціхія...»***
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар.
**11.35, 12.10, 19.50 Серыял «Дыверсант. Канец вайны».*****
**14.00 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».*****
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.30 Серыял «Позняе раскаянне».*****
**16.30, 0.00** Сфера інтарэсаў.
**17.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Швейцарыя — Беларусь.
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.00 Серыял «След».*****
**0.35** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 23.45** Тэлебарометр.
**9.05, 18.05 Серыял «Каханне і іншыя недарэчнасці...»*****
**11.20, 17.00 Серыял «Анжаліка». Заключныя серыі.*****
**12.30, 20.10** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**15.15** Кіслы comment.
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05 Трылер «Тут нехта ёсць...»*****
**21.30** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**21.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Паўфінал. «Атлетыка» (Мадрыд, Іспанія) — «Рэал» (Мадрыд, Іспанія). Матч у адказ.
**23.50** «Анлайн». Скетчкам.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Шчаўе з ліньком.
**8.05, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15, 15.50, 20.20, 23.25** «Гэты дзень».
**8.25, 18.55 «Соль зямлі». Драма. 1-я серыя.***
**9.30, 13.25 «Таемная прагулка». Драма.***
**10.50, 14.45** М/ф.0
**11.10, 15.55 «Чыста англійскія забойствы». Дэтэктыў. «Смерць незнаёмца». 1-я серыя.*****
**12.20** «Камертон». Народны мастак Беларусі Анатоль Бараноўскі.
**12.45, 20.25** «Грані Перамогі». «Дзень Перамогі». Частка другая.
**13.00** «Дзённікі беларускага падполля». Гродна.
**14.55** «Наперад у мінулае».
**15.20** «СССР — музыка пад забаронай». Аляксандр Разенбаум.
**16.45, 21.05** «Зафрантавыя разведчыкі». Дак. фільм. 1-я серыя.*
**17.25 «Снайпер. Зброя помсты». Баявік. 1—2-я серыі.***
**20.40** «Калыханка».
**21.40 «Сляды апосталаў». Маст. фільм. 1—2-я серыі.***

### Беларусь 5

**7.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/2 фіналу. Матч у адказ. «Ювентус» (Італія) — «Манака» (Францыя).
**9.45** Хакей. Чэмпіянат свету. Славакія — Данія.
**11.40, 23.25** Хакей. Чэмпіянат свету. Агляд гульнявога дня.
**12.10** Козел пра футбол.
**12.30** Слэм-данк.
**13.00** Тэніс. Турнір WTA. Мадрыд.
**17.05** Хакей. Чэмпіянат свету. ЗША — Італія. (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**19.20** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. ФК «Мінск» — «Дынама-Мінск». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**21.15** Хакей. Чэмпіянат свету. Фінляндыя — Славенія. (У другім перапынку — Спорт-цэнтр.)
**23.55** Хакей. Чэмпіянат свету. Славакія — Германія.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.15** «Смак».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15** «Сёння ўвечары».
**16.20** «Адваротны адлік».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Кантрольная закупка».
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Па законах ваеннага часу».***
**23.00** «Вячэрні Ургант».
**23.40** «Давай пажэнімся!»
**0.40** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30 Маст. фільм «Афіцэры».***
**10.10, 10.40 «Замах». Серыял.**
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30 Маст. фільм «Экіпаж машыны баявой».***
**15.55** «Цэнтральны рэгіён».
**16.50** «Аўтапанарама».
**17.10** «Вадзіць па-руску».
**17.35** «Ведай нашых».
**17.50** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.05** «Вадзіць па-руску».
**23.20** «Гарачы лёд».
**23.40** «Тайны Чапман».
**0.30 Маст. фільм «Каханыя Марыі».*****

### МІР

**6.05** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**7.30** Добрай раніцы, свет!***
**9.00 Серыял «Калі растаў снег».*****
**12.30** «Любімыя акцёры. Леанід Быкаў».*
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Няма праблем!»***
**14.55** Дак. фільм «Сямейныя драмы».***
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».*****
**19.20, 6.05 Серыял «Закон і парадак».*****
**22.15 Маст. фільм «Дом, мілы дом».***
**0.05 Серыял «Спрут».*****
**3.50 Серыял «Гарачы лёд».*****

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**12.00** «Ордэны Вялікай Перамогі».
**12.55** «Іду на таран».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Скліфасоўскі».**
**19.15, 20.40 Серыял «Асабістая справа».**
**22.00, 23.10 Серыял «Гатэль «Прэзідэнт».**
**0.40** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.05** «Вызваліцелі».*
**7.10, 8.05 Серыял «Час Волкава».*****
**9.00 Серыял «Мухтар. Новы след».*****
**9.45** «За гранню».
**10.20 Серыял «Ляснік».*****
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 16.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Дарожны патруль».*****
**17.05 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».*****
**19.40 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч».*****
**22.20** «Вынікі дня».
**22.50** «НЗ.by».
**23.10 Серыял «Шэф».*****

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**8.00 Серыял «Чатыры таксісты і сабака».**
**9.00, 17.30 Серыял «Гранд гатэль».**
**10.15** «Сябры дзядулі Марка».
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00 Драма «Дарагі мой чалавек».**
**12.45, 19.20 Серыял «Імперыя».**
**14.20 Серыял «Прыгоды маладога Індыяны Джонс».**
**15.55, 19.15, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** «Мультпарад».
**16.25 Серыял «Доўгая дарога ў дзюнах».**
**18.45** «Мой любімы гадаванец».
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Драма «Мы з будучыні».**
**23.10 Серыял «Футбалісты».**
**23.35** Дак. фільм.

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».***
**6.30, 3.25** М/ф «Ека».0
**6.50, 3.45** М/ф «Смяшарыкі».0
**7.10, 4.05** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**7.30, 4.25** «Ералаш».0
**8.30** Серыял «Сямейны бізнес».***
**9.30** Трылер «Пахаваны зажыва».***
**11.35** Скетч-шоу «6 кадраў».***
**12.00, 5.10** Серыял «Я лячу».***
**13.00** «Паспецы за 24 гадзіны».***
**14.10** «Сэрцы за каханне».***
**14.50** «Узважаныя людзі».*
**16.50** Серыял «Закрытая школа-2».***
**17.50, 23.45** «Уральскія пельмені».***
**19.00** Серыял «Гатэль «Элеон».***
**20.40** Серыял «Геймеры».***
**21.50** Меладрама «Вулічныя танцы».*
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка».***
**1.50** Серыял «Месяц».***
**2.40** «Не можа быць!»***

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.40** «Назіральнік».
**11.15, 23.50** «Мегрэ расстаўляе пасткі». Маст. фільм.
**13.15, 18.25, 2.40** Сусветныя скарбы.
**13.30** «Пешшу...» Масква залатагаловая.
**14.05, 22.35** «Сакрэты Месяца». Дак. серыял. 1-я серыя.
**15.10** «Застава Ільіча». Маст. фільм.
**18.40** «Адлюстраваны час». Дак. серыял.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.00** «Абсалютны слых».
**20.40** «Правілы жыцця».
**21.10** Улада факта. «Масоны. Міфы і факты».
**21.55** «Больш чым каханне». Валерый і Марына Фрыд.
**23.45** Мастсавет.

### Настальгія

**6.00, 13.40, 19.20** Маст. фільм «Месца сустрэчы змяніць нельга».***
**8.15, 9.40, 11.00, 14.45, 15.40, 19.00, 20.30, 21.40, 5.40** Музычная настальгія.*
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час».*
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».*
**17.00, 23.00** «Песня-80».*
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Дзеці палітычнай эліты». 2005 год.***
**0.00** Маст. фільм «Дом, які пабудаваў Свіфт».*
**2.20** Канцэрт гуртоў «Машина времени» і «Цветы».***
**3.25** Маст. фільм «Начныя забавы».***

### EuroSport 1

**4.00, 7.00, 11.30, 18.30, 23.00, 1.30** Футбол. Юнацкі чэмпіянат Еўропы (U-17).
**5.30, 9.30, 15.00, 22.00, 0.30, 2.30** Веласпорт. «Джыра д'Італія».



**8.30, 21.00** Футбол. «ФІФА».
**9.00, 21.30** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**9.30** Зімовыя віды спорту. «У пагоні за гісторыяй».
**11.00** Ралі. ERC.
**14.45, 18.15** Веласпорт. «Джыра-экстра».
**20.00** Фрыстайл мотакрос. Вечар скачкоў.

### Кінакамедыя

**0.35** Меладрама «Юнацтва, што бунтуе».***
**2.10** Прыгоды «Сіньёр Рабінзон».***
**4.05** Камедыя «Кахае не кахае».***
**05.35** Камедыя «Піжон».***
**7.15** Меладрама «Якая ты прыгожая».*
**8.50** Меладрама «Увесь гэты джэм».*
**10.30** Камедыя «Скандынаўскі фарсаж».***
**12.15** Камедыя «Скандынаўскі фарсаж. Гонкі на лёдзе».***
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».***
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».***
**16.00** Дэтэктыў «Забойства на траіх».*
**17.50** Прыгоды «Чатыры таксісты і сабака».***
**19.40** Камедыя «Забойны агеньчык».***
**21.25** Камедыя «Як страціць сяброў і прымусіць усіх цябе ненавідзець».***
**23.25** Камедыя «Сакрэты сексу і кахання».****

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.10** «Ёсць адзін сакрэт».
**8.35** «Доктар І...»
**9.05, 18.55, 3.00** «Вузел лёсу». Серыял.
**10.35, 4.30** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**12.15** «Сляпая».
**13.15** «Варажбітка».
**14.20** «Паралельны свет».
**15.15** «Трэнд».
**15.45** «Здзелка».
**16.15** «Натуральны адбор».
**17.15** «Неспакойны ўчастак». Серыял.
**20.45** «Магазіна».
**21.45** «Рэвізора».
**22.45** «Лінія абароны».
**23.15** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.00** «Гаспадар мораў». Маст. фільм.***
**2.10** «Амерыканскі жаніх».

### ТБ1000

**6.10, 18.00** Ён, я і яго сябры.***
**8.20** Спадар Ніхто.*
**11.00** Гладыятар.*
**14.05** Прабач за каханне.***
**16.25** Труп нявесты.*
**20.10** Адвакат д'ябла.***
**22.55** Правілы здыму: метад Хітча.*



**1.15** Спіс Шындлера.***
**4.40** Станцыя «Фрутвейл».****

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Перакладчык.*
**10.20** Забарона.***
**12.10** Дзюба-Дзюба.***
**14.45** Спартак і Калашнікаў.0
**16.40** Калектар.***
**18.15** Граф Мантэнегра.*
**20.20** Каробка.*
**22.20** Завея.****
**0.05** Радзіма.****
**2.25** Мы з будучыні.***
**4.35** Практыкаванні ў выдатным.***

### National Geographic

**6.00, 13.25** Гульні розуму.*
**6.50, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.*
**7.55, 14.55** Міжнародны аэрапорт Дубай.*
**8.45, 11.05, 15.40** Ледзяная дарога.*
**9.30** Геній.*
**10.20, 22.30** Эвакуацыя Зямлі.***
**11.50, 16.25, 19.30, 23.20, 2.20** Расследаванні авіякатастроф.*
**12.40, 18.40, 20.15, 21.45, 1.35, 4.45** Пачатак.*
**18.00, 21.00, 0.50, 3.55** Інстынкт выжывання.***

### Discovery

**8.00, 14.00, 0.00, 3.50** Выжыць любой цаной.*
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?*
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?*
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі.*
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Паляўнічыя на склады.***
**11.00** Узрываючы гісторыю.
**17.00, 22.00, 6.20** Махінатары.*
**18.00, 1.00** Залатая ліхаманка.***
**19.00, 2.00** Ратавальнікі-цяжкавагавікі.***
**20.00** Тэхнагеніка.*
**2.55** Кола: гульня на выжыванне.***
**4.40** Маланкавыя катастрофы.***

## Усходні гараскоп на



**АВЕН.** Праблемы мінулых дзён адыдуць на задні план, а вашы нечаканыя рашэнні прынясуць цудоўны вынік. Можаце атрымаць бліскучую перамогу над канкурэнтамі. Не варта дзяліцца сваімі эмоцыямі з навакольнымі, вас могуць няправільна зразумець. Пастарайцеся рацыянальна размеркаваць сілы з панядзелка да нядзелі. Творчасць у адасабленні дазволіць павысіць самаацэнку. Каб паспяхова ажыццявіць задумы і планы, давядзецца стаць больш уступлівымі і дыпламатычнымі.



**ЦЯЛЕЦ.** Першая палова тыдня будзе бедная на падзеі, таму яна вельмі падыходзіць для адпачынку. Самы час чымсьці сябе пацешыць. Мітусня перад пачаткам адпачынку перакрэсліць усе сумныя планы і пацягне ў казачны свет фантазіі. Паспрабуйце напоўніць свой дом цяплом клопату аб блізкіх людзях, каб вам было цёпла і ўтульна разам з імі. У другой палове тыдня лепш не правакаваць канфлікты. Занятак любімай справай дапаможа не расходаваць, а назапасіць сілы.



**БЛІЗНЯТЫ.** Прысвяціце досыць часу адпачынку і ўзнаўленню сіл, пазбягайце перагрузак на працы, лепш не пачынаць новых праектаў. Дайце падзеям магчымасць ісці сваім парадкам. Пастарайцеся не прапусціць важнай інфармацыі, якая можа спрыяць вашай фінансавай стабільнасці. Тыдзень абяцае добрыя перспектывы ў сферы прафесійнай дзейнасці. Калі не будзеце расходаваць свае разумовыя здольнасці на дробязі, то зможаце справіцца з многімі важнымі задачамі. Успомніце пра сяброў.



**РАК.** Калі вы імкняцеся да поспеху, то неабходна вызначыцца з прынцыпамі і выразна для сябе высветліць, што менавіта вы хочаце і чым гатовыя ахвяраваць. Першыя два дні пройдуць пад знакам разважанняў, няўпэўненасці і нават трывогі. Паспрабуйце не зацыклівацца на дробязях і не саромейцеся звяртацца па дапамогу да сяброў і сваякоў. Чацвер можа аказацца даволі неадназначным днём: магчымыя інтрыгі, плёткі. А вось пятніца спрыяльная для пачатку спраў — як вялікіх і важных, так і нязначных.



**ЛЕЎ.** Тыдзень можа стаць прыдатным часам для перагляду сістэмы каштоўнасцяў, а таксама для ўдасканалення тэорыі ў практыку. Старайцеся ацэньваць справы з пункту гледжання дальняй перспектывы. Падзеі тыдня адгукнуцца ў аддаленай будучыні. Хоць і павольна, але вы рухаецеся да вызначаных мэт. Вас можа падцікоўваць падман ці спакушэнне, так што асцярожнасць і акуратнасць у дзеяннях будуць своечасовыя і дарэчныя.



**ДЗЕВА.** Будзеце як ніколі ўпэўненыя ў сваіх сілах і праваце. Паспрабуйце быць больш асцярожнымі з публічнымі выступамі, старанна падбірайце словы, вашы апаненты могуць вытлумачыць іх на сваю карысць, павярнуўшы супраць вас. Таксама варта асцерагацца плётак. Пачынайце новыя цікавыя справы, рэанімуйце ранейшыя праекты, перад вамі могуць адкрыцца новыя перспектывы, калі не будзеце залішне прынцыповыя. Можаце адначасова праявіць ветлівасць і настойлівасць, а менавіта гэта — каштоўны ключ да поспеху.

## наступны тыдзень



**ШАЛІ.** Тыдзень абяцае быць насычаным, прычым самымі рознымі справамі. Можа прапасці на час інтарэс да пытанняў кар'еры — замест яе на першы план можа выйсці імкненне да асабістай свабоды ці хоць бы ілюзорнага адчування яе. Магчыма, захочацца прымераць на сябе ролю вольнага мастака. Пастарайцеся не ўпадаць у крайнасці і не адыходзіць ад спраў далёка і надоўга. Варта захоўваць спакой і ўпэўненасць ва ўласных сілах.



**СКАРПІЁН.** Пажадана не мітусіцца, паспрабуйце прытрымлівацца пэўных правілаў і ўхіляйцеся ад унутранай супярэчнасці, калі яны ўзнікнуць. Пастарайцеся не ўпірацца і будзьце гатовыя перагледзець свае прынцыпы. Будзьце асабліва акуратныя і прадбачлівыя, інакш некаторыя вашы пазіцыі могуць пахіснуцца. Вам могуць зрабіць перспектыўную дзелавую прапанову, якая адкрые новыя магчымасці. Калі будзеце ўважліва слухаць і чуць, то зможаце дасягнуць узаемаразумення нават з самымі незгаворлівымі людзьмі.



**СТРАЛЕЦ.** Асноўную частку часу паглыне праца. Пажадана паставіць перад сабой дакладную мэту і прытрымлівацца яе. Тыдзень цікавы і насычаны падзеямі, важна правільна размеркаваць уласныя сілы і энергію. Сярэдзіна тыдня — выдатны перыяд для стварэння падмурка будучага прасоўвання па кар'ернай лесвіцы. Варта пазбягаць людзей са злым характарам і негатыўнымі адносінамі да жыцця. У другой палове тыдня падвернуцца выгадная работа ці дадатковы заробак — давядзецца арыентавацца па сітуацыі.



**КАЗЯРОГ.** Пастарайцеся не адмаўляць у дапамозе людзям, якія да вас звяртаюцца. Вы здольны прыцягнуць увагу іншых, спалучаючы аптымізм і гібкасць у паводзінах, — і такая стратэгія дасць свой вынік. Здзейсняючы чарговы подзвіг, не забудзьцеся хоць зрэдку пацікавіцца навакольным светам. У зносінах з дзелавымі партнёрамі спатрэбяцца такія якасці, як цярпенне, уступлівасць і ўменне рэальна ацаніць сітуацыю.



**ВАДАЛЕЙ.** Не правакуйце сваімі дзеяннямі і выказваннямі незадаволенасць навакольных. Давядзецца адказваць за свае старыя ўчынкі. Рабіце для іншых толькі тое, што зрабілі б для сябе, і не займайцеся самападманам: прыхарошваць рэчаіснасць зараз не варта. Удалы час для карэкціроўкі ранейшых дзеянняў і выпраўлення дапушчаных промахаў і недахопаў. Канкурэнты нагадаюць аб сваім існаванні. Магчымы невялікі канфлікт з начальствам, паспрабуйце захоўваць спакой, бо сітуацыя не паўплывае на вашу далейшую кар'еру і хутка вычарпае сама сябе.



**РЫБЫ.** Можа з'явіцца магчымасць завесці знаёмствы ў раней недаступных для вас галінах. Аднак будзьце асцярожнымі, бо ваш напор можа выклікаць супрацьдзеянне з боку магчымых партнёраў. Перад тым як завязаць кантакты, растлумачце свае мэты блізкім людзям, інакш можаце атрымаць у якасці рэакцыі выбух рэўнасці. У другой палове тыдня вас могуць наведаць цудоўныя ідэі, а валоданне важнай інфармацыяй прыцягне многа прыхільнікаў — нават з апазіцыйнага лагера.

## Чацвер, 11 мая

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.35** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.00** Зона Х.
**9.10, 10.05 Драма «А золкі тут ціхія...»***
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар.
**11.35, 12.10, 20.00 Серыял «Дыверсант. Канец вайны».*****
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00, 16.30 Серыял «Самейныя меладрамы-6».*****
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.30 Серыял «Позняе раскаянне».*****
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.15** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Спецыяльны рэпартаж.
**22.00** Міжнародны конкурс песні «Еўрабачанне-2017». Другі паўфінал.
**0.55** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.45** Тэлебарометр.
**9.05, 18.05 Серыял «Каханне і іншыя недарэчнасці...»*****
**11.15, 19.30** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**13.40** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.10 Трылер «Тут нехта ёсць...»*****
**17.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Чэхія — Нарвегія.
**21.50** Спортлато 6 з 49, КЕНО.

**22.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Паўфінал. Матч у адказ.
**0.05** «Анлайн». Скетчкам.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.40** «Беларуская кухня». Ножкі ў фасолі. Яблычны дэсерт.
**8.05, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15, 15.50, 20.20, 23.25** «Гэты дзень».
**8.25, 18.55 «Соль зямлі». Драма.***
**9.30, 13.25 «Пані Марыя». Меладрама.***
**10.55** М/ф.0
**11.10, 15.55 «Чыста англійскія забойствы». Дэтэктыў. «Смерць незнаёмца». 2-я серыя.*****
**12.20** «Свято далёкай зоркі». Памяці мастака-графіка Анатоля Тычыны.
**12.45, 20.25** «Грані Перамогі». «Песні Перамогі». Частка першая.
**13.00** «Дзённікі беларускага падполля». Магілёў.
**14.50** «Наперад у мінулае».
**15.20** «СССР — музыка пад забаронай». Гурт «Крэматорый».
**16.45, 21.05** «Зафрантавыя разведчыкі». Дак. фільм.*
**17.20 «Снайпер. Зброя помсты». Баявік. 3—4-я серыі.***
**20.40** «Калыханка».
**21.40 «Сляды апосталаў». Маст. фільм. 3—4-я серыі.***

### Беларусь 5

**8.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/2 фіналу. Матч у адказ.
**10.00** Хакей. Чэмпіянат свету. Швейцарыя — Беларусь.
**12.00, 23.25** Хакей. Чэмпіянат свету. Агляд гульнявога дня.
**12.30** Слэм-данк.
**13.00** Тэніс. Турнір WTA. Мадрыд. 1/4 фіналу.
**15.00, 19.30** Муай-тай. Чэмпіянат свету. Мінск.

**17.05** Хакей. Чэмпіянат свету. Расія — Данія. (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**21.05** Хакей. Чэмпіянат свету. Швецыя — Латвія. (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**23.55** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/2 фіналу. Матч у адказ.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.15** «Смак».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Кантрольная закупка».
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Па законах ваеннага часу».***
**23.00** «Вячэрні Ургант».
**23.40** «Давай пажэнімся!»
**0.40** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.25** «Тайны Чапман».
**9.25, 17.55** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.20, 10.40 «Замах». Серыял.**
**13.50** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**15.35** «У нас усе дома».
**16.05** «Скардзіцца дазваляецца».

**16.50** «Мінск і мінчане».
**17.35** «Вадзіць па-руску».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Дзіўная справа».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.05** «Аўтапанарама».
**0.20 Маст. фільм «Акатоне».*****

### МІР

**6.55** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**7.30** Добрай раніцы, свет!***
**9.00 Серыял «Калі растаў снег».*****
**12.30** «Любімыя акцёры. Святлана Кручкова».*
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Няма праблем!»***
**14.55** Дак. фільм «Сямейныя драмы».***
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».*****
**19.20, 4.20 Серыял «Закон і парадак».*****
**22.15 Маст. фільм «Эфект даміно».*****
**0.00 Серыял «Спрут».*****
**2.05 Серыял «Гарачы лёд».*****

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.00** «Пакой смеху».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Скліфасоўскі».**
**19.15, 20.40 Серыял «Асабістая справа».**
**21.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**22.00, 23.10 Серыял «Гатэль «Прэзідэнт».**
**0.40** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТВ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.05** «Вызваліцелі».*
**7.10, 8.05 Серыял «Час Воўкава».*****
**9.00 Серыял «Мухтар. Новы след».*****
**9.45, 22.50** «НЗ.by».
**10.20 Серыял «Лrandа**
